ДЗЕ ДРУЖНА — ТАМ ХЛЕБНА!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ВЕРАСНЯ 2010 г.
СУБОТА
№ 188
(26796)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ГАЛОЎНАЙ МЭТАЙ ЛЮБОГА КІРАЎНІКА ПАВІНЕН БЫЦЬ КЛОПАТ ПРА ЛЮДЗЕЙ І ІХ ДАБРАБЫТ»

Аб гэтым заявіў учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, выступаючы перад студэнтамі і выкладчыкамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што кіраўнікі любога ўзроўню «павінны быць бліжэй да людзей». «Таму што самае вялікае багацце, як бы гэта банальна ні гучала, — гэта нашы людзі. І калі нам удасца павысіць узровень дабрабыту нашых людзей, значыць на два парадкі, на два ўзроўні павысіцца дабрабыт дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

«Падбор і падрыхтоўка менавіта такіх людзей, якія будуць клапаціцца аб нашым народзе, нашай дзяржаве павінны быць асновай дзяржаўнай кадравай палітыкі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў асаблівую ролю Акадэміі кіравання ў павышэнні кваліфікацыі кіраўнікоў і спецыялістаў сферы кіравання. На думку Прэзідэнта, важна не проста колькасць, а якасць выпускнікоў. Перад Акадэміяй кіравання стаяць вельмі адказныя задачы, паколькі менавіта тут фарміруецца той кіраўніцкі корпус, які павінен займаць кіраўніцкае становішча на прадпрыемствах, у рэгіёнах, у органах улады.

На думку Прэзідэнта, да навучання кіраўніцкіх кадраў неабходна ўкараняць практыка-арыентаваны падыход. Акрамя таго, кіраўнік павінен умець не толькі адказваць на выклікі часу, але, што больш важна і складана, прагназаваць развіццё. Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на неабходнасць больш шырокага выкарыстання ў адукацыйным працэсе практычнага вопыту, а таксама бесперапыннасць падрыхтоўкі кіраўніка. Гаворачы аб выкладчыках, кіраўнік дзяржавы выказаў думку, што іх неабходна падбіраць на конкурснай аснове. Адным з асноўных правілаў любога кіраўніка павінен быць глыбокі аналіз перадавога замежнага вопыту і ўкараненне яго ў сябе.

Прэзідэнт у сваім выступленні закрануў таксама і маральны аспект кіраўніка. На яго думку, абсалютна недапушчальнымі для кіраўніцкіх кадраў з'яўляюцца карупцыя і бюракратызм. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў барацьбе з бюракратызмам у краіне ёсць зрухі.

Гаворачы аб ролі дзяржавы ў сучасным свеце, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта зусім не простае пытанне. «Здаецца, мы ўсе разумеем, што такое дзяржава, для чаго яна існуе і чым займаецца. Але варта толькі паглыбіцца ў гэту праблему, як перад намі паўстаюць самыя разнастайныя пытанні: што павінна браць на сябе дзяржава і ад чаго адмаўляцца, — сказаў ён. — Дзяржава — гэта «начны вартаўнік» або гэта штосьці іншае? У розны час у розных краінах падыходы былі неаднолькавыя. Ад гэтага залежалі лёсы народаў, а таксама кадравая палітыка». Адна справа — дзяржава, якая не ўзвальвае на сябе вялікі груз адказнасці і, абмяжоўваючыся мінімумам функцый, проста наглядае за ходам падзей. Іншая — калі яна бярэ на сябе поўную адказнасць за лёс грамадства, за сучаснае і будучае краіны. «Глыбока перакананы, што роля дзяржавы ў сучасным свеце вялікая і вельмі актыўная ва ўсіх сферах, уключаючы эканоміку і палітыку», — сказаў Прэзідэнт.

У пацвярджэнне сваіх слоў ён прывёў прыклад сітуацыі, якую выклікаў сусветны фінансавы крызіс. «Прычына гэтага крызісу якраз у тым, што дзяржава аддала на водкуп прыватнікам, а часам і выпадковым людзям фінансавую сістэму. У выніку абваліліся банкі, абвалілася эканоміка. І калі краіны паспрабавалі выйсці з крызісу, яны перш за ўсё ўзмацнілі ролю дзяржавы. Тады пачалі рабіць і ў Еўропе, і ў Амерыцы тое, што Беларусь рабіла заўсёды, за што нас, і перш за ўсё мяне, пастаянна крытыкавалі», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«У гэты крызіс час паказаў, хто меў рацыю і хто вінаваты. Вывад адзін: дзяржаве быць, і дзяржава, наколькі магчыма, павінна ўмешвацца ва ўсе працэсы жыцця грамадства. Але ні ў якім выпадку не ўмешвацца ў тыя працэсы, дзе яна сёння не можа і не павінна кіраваць», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларуская дзяржава пры любой сітуацыі можа прымаць эфектыўныя меры і забяспечваць парадак, сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё і стабільнасць у краіне.

Паводле слоў Прэзідэнта, у памяці людзей засталіся сур'ёзныя наступствы дэструктыўных працэсаў, якія адбыліся ў самым пачатку 1990-х гадоў у выніку распаду Савецкага Саюза. «Як толькі палі прывычныя інстытуты, іх месца імгненна запоўнілі крымінальныя групоўкі. Яны захоплівалі не толькі цэлыя прадпрыемствы, але і рэгіёны. Станавіліся не ценявой, а самай сапраўднай уладай, прымушаючы грамадства жыць па сваіх паняццях, — сказаў ён. — У сярэдзіне 1990-х гадоў нам давялося ўладу аднаўляць літаральна з попелу. І зусім не з-за таго, што так ужо хацелася над кімсьці паўладарыць. Іншага шляху проста не было. Надзеі на прыватную ініцыятыву грамадзян, самаарганізацыю грамадства і самаразвіццё эканомікі тады не было. Бедныя людзі, закрытыя або на мяжы банкруцтва прадпрыемствы, збітае з толку грамадства, разгубленая інтэлігенцыя, выгнаныя з лабараторый на рэчавыя рынкі навуковыя работнікі — хіба можна было патрабаваць ад кагонебудзь з іх стаць лакаматывам, які вывеў бы грамадства з крызісу?»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ва ўмовах з'яўлення дзесяцігоддзя, якія змагаліся за тое, каб канчаткова разбіць дзяржаву, разагнаць кіраўнікоў і распрадаць усю ўласнасць, ім быў абсалютна свядома пачаты працэс умацавання дзяржавы. «Адначасова мы вучыліся эфектыўна кіраваць уласнасцю, гаспадарыць ва ўмовах рынку, развівалі грамадства, набывалі навыкі самакіравання. Гэта значыць, укаранялі ў сябе тыя ж эканамічныя і сацыяльныя інстытуты, што і развітыя краіны, але з розумам», — адзначыў ён.

Паводле слоў Прэзідэнта, у Беларусі быў выбраны шлях удумлівага, пакрокавага ўвасаблення агульнапрынятых стандартаў з улікам спецыфікі пераходных працэсаў у краіне і нацыянальных інтарэсаў.

«Жыццё даказала правільнасць такога падыходу. Прайшлі гады — і мы атрымалі пацвярджэнне сваёй праваты, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. — Таму для Беларусі не падыходзіць трактоўка ролі дзяржавы як «начнога вартаўніка» і пасіўнага наглядальніка, які жывё толькі за кошт падаткаў. Мы зрабілі стаўку на моцную дзяржаву, якая ўзяла на сябе адказнасць за вельмі многія сферы, і пакуль ні разу аб гэтым не пашкадавалі».

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка раскрытыкаваў якасць падрыхтоўкі кадраў у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

«У мяне пакуль не склалася перакананасці ў тым, што наша акадэмія рыхтуе кіраўнікоў, па-першае, і, па-другое, — добрых кіраўнікоў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Рэктар акадэміі Анатоль Маразевіч далажыў кіраўніку дзяржавы аб бягучым стане і планах па развіцці навучальнай установы. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на тое, што нядрэнна было б пабудаваць асобны акадэмгарадок. Кіраўнік дзяржавы задаў пытанне: «У нас што, у гэтых двух будынках не хапае месца для падрыхтоўкі кіраўнікоў, якія нам патрэбны? Калі размова ідзе аб будаўніцтве гэтага новага цэнтра, адразу ўзнікае пытанне: для падрыхтоўкі каго і чаго? У нас і так стаіць пытанне аб лішку падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй».

СТАР. 2

НЕ ХАВАЮЧЫ радаснага хвалявання, сказаў жыхар вёскі Прыазёрная Сяргей Луцко пра свайго сына Аляксандра, які стаў лепшым камбайнерам Брэстчыны сярод моладзевых экіпажаў, намалаціўшы на сваім КЗС-7 тысячу семсот сорак восем тон хлеба.

Пакуль сын-пераможца збіраецца ў дарогу, апранае лепшы касцюм, а другі, спецыяльна пашыты для яго на свята, упакоўвае ў вялікую сумку, Сяргей Уладзіміравіч дзеліцца шчырымі бацькоўскімі пачуццямі:

— Ён ішоў да гэтай перамогі чатары гады, займаючы таксама прызавыя месцы, але не першае. Каб стаць лідарам жніва, хлопцу не хапала усяго то 50, то 60 тон. Сёлета ў яго не было ніводнай паломкі, ніводнай гадзіны прастою — працаваў упэўнена, хутка, якасна. Ад цямна да цямна. Я нават па-бацькоўску яго шкадаваў.

Насамрэч 24-гадовы працаўнік сельгасвытворчага ўчастка «Прыазёрнае» птушкафабрыкі «Дружба» Баранавіцкага раёна Аляксандр Луцко ішоў да гэтага дня, можна сказаць, з трохгадовага ўзросту, калі прасіўся ў кабіну да дзеда-трактарыста. А дзед заўсёды быў сярод лепшых механізатараў калгаса. Так што прыклад было з каго браць. Ды і бацька таксама перадаваў сваю любоў да механізмаў і машын. Спачатку Аляксандр скончыў ПТВ і атрымаў правы на ўпраўленне трактарнай тэхнікай. Потым вучыўся ў каледжы. Два гады працаваў памочнікам, а яшчэ чатыры гады — старшым камбайнерам. Цяпер завочна вучыцца ў БАТУ. Ад бацькі, які працуе побач, на адным мехдвары, навучыўся разбірацца ў складаных агрэгатах. Некалькі гадоў таму яны разам удасканалілі КЗС, на якім малодшы Луцко і выйшаў сёлета ў рэспубліканскія лідары.

Яго праводзілі, як і належыць, усёй сям'ёй. Нават дзвюма. Сёлета Аляксандр ажаніўся, ягоная жонка Наталля працуе бухгалтарам у суседняй гаспадарцы. Яна нават адпрасілася з працы, каб дапамагчы мужу сабрацца, пажадаць незабыўных ураджанняў на «Дажынках» і абавязкова атрымаць галоўны прыз. Якія ж праводзіны без бацькоў! Тым больш, што Алена Іосіфаўна, дыспетчар, Сяргей Уладзіміравіч, вядучы інжынер гаспадаркі «Прыазёрнае», працуюць цяпер побач. Але радуюцца яны яшчэ і таму, што сёлета з «Дружбы», акрамя сына, у Ліду паехалі яшчэ адзін камбайнер, шэсць вадзіцеляў і галоўны аграном. Такой вялікай і дружнай хлебаробскай каманды з адной гаспадаркі ў гісторыі «Дажынак» яшчэ не было!

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

«МОЙ СЫН ЗАСЛУЖЫЎ ГЭТУЮ ПЕРАМОГУ...»

Момант праводзін Аляксандра ЛУЦКО на рэспубліканскае свята «Дажынкі».

«ЭХ, ДАЖЫНАЧКІ!»

«Сардэчна вітаем на лідскай зямлі!» — сустракаюць саламяныя «сяляне» на 33-м кіламетры па аўтатрасе з Гродна. А бліжэй да Ліды, на 25-кіламетры — саламяны млын, потым — саламянае сонейка, вясковая прыгажуня... Чаму б гэта? А таму, што ўчора ў Лідзе распачалося дзейства, якім ужо традыцыйна вызначаецца ў Беларусі першы восеньскі месяц. Стартаваў чатырнаццаты па ліку рэспубліканскі кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі- 2010». Тысячы гасцей з'ехалася ў старажытны горад, каб разам з лідчанамі, як кажуць у нас, талакой ушанаваць лепшых аграрнікаў краіны. І добрым словам, і каштоўнымі прызамі. І, вядома, цікава адпачыць, каб гэтае свята запомнілася на доўгія гады.

Калі тэатр пачынаецца з вешалкі, то горад, напэўна, з вакзала. На лідскім інтэрнэт-форуме напярэдадні «Дажынак» было шмат пытанняў: а ці можна будзе ўехаць у горад? Мо не будуць хадзіць ні аўтобусы, ні цягнікі? Аказалася, што чуткі абсалютна беспадстаўныя. Зразумела, што рух транспарту ў цэнтральнай частцы горада быў абмежаваны, а вось вакзалы працавалі ў нармальным рэжыме. У чым і пераканаўся карэспандэнт «Звязды», калі ўчора раніцай прыехаў з Гродна ў сталіцу сёлетніх «Дажынак». І тут жа ўбачыў змены, што адбыліся на адным з рэканструяваных да свята аб'ектаў — аўтавакзале. Добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол яго, устанавілі новыя лаўкі. Папрыгажэў, кардынальна змяніўся і сам будынак вакзала, прычым не проста дзеля «марафету», каб пахваліцца перад гасцямі, а для зручнасці пасажыраў на перспектыву. У выніку рэканструкцыі значна павялічылася карысная плошча, якой змогуць скарыстацца розныя прадпрыемствы сферы паслуг. З'явіліся і тэхналагічныя навінкі. У прыватнасці, у падобным на банкамат інфа-кіёску цяпер можна атрымаць любую інфармацыю пра аўтобусны рух па ўсёй краіне. Па-новаму зробленыя і пасадачныя платформы: заехаўшы на кожную з іх, аўтобус, як было раней, не разварочваецца, а пасля высадкі пасажыраў рухаецца ўперад і выязджае на маршрут.

І гэта толькі адзін штрых да падрыхтоўкі Лідчыны да сёлетніх Дажынак. А ўвогуле сярод «дажыначных», пабудаваных альбо абноўленых за сродкі рэспубліканскага, мясцовых бюджэтаў, лідскіх прадпрыемстваў і арганізацый — 220 аб'ектаў. Фінансавыя затраты — каля 350 мільярдаў рублёў. Не дзеля карцінкі для свята, а для мясцовых жыхароў.

У гэтым, пакуль не распачаліся асноўныя падзеі свята, пераконваюся ў раённым Доме культуры, прабачце, цяпер ужо Палацы — такі статус атрыманы пасля рэканструкцыі. Так, радуюць вока выдатныя інтэр'еры ў глядзельнай і танцавальнай залах, класе харэаграфіі, дзіцячай бібліятэцы. Але, бадай, галоўнае у, скажам так, творчай «начынцы». Аказваецца, тут ажно тры толькі тэатральныя калектывы: «Какос» (ад шасцігадовага ўзросту), тэатральны гурток «Light-Art» (ад 16 гадоў) і народны тэатр «Ракурс» (ад 20 гадоў). Увогуле ж на базе Палаца культуры цяпер працуе 36 аматарскіх калектываў, у тым ліку 12 — са званнем «народны» і «ўзорны».

Другое дыханне атрымала і дзіцячая школа мастацтваў, для якой рэканструявалі будынак былога Дома афіцэраў. Мо дзесьці і лепш, але аўтару гэтых радкоў пакуль не даводзілася бачыць у райцэнтры падобнай па аснашчанасці музычнымі інструментамі і абсталяваннем установы. На карысць лідчан і Цэнтр народных рамёстваў і традыцый, Лядовы палац, зала гульнявых відаў спорту, лыжароллерная траса... А таксама цэнтральная, галоўная пляцоўка горада, якая, зноў жа, паслужыць не толькі «Дажынкам-2010», але і наступным святам і імпрэзам.

СТАР. 3

Белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО НА ОСНОВАНИИ ТРЕБОВАНИЯ ПРАВЛЕНИЯ БАНКА И В СООТВЕТСТВИИ С РЕШЕНИЕМ НАБЛЮДАТЕЛЬНОГО СОВЕТА БАНКА СОЗЫВАЕТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

Дата проведения Общего собрания акционеров:
1 октября 2010 года.

Адрес проведения Общего собрания акционеров:
220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 23 сентября 2010 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 29 сентября 2010 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 8 октября 2010 года.

Телефоны для справок: 8(017) 229 64 54, 229 64 51.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Арэнда жылля

ПОПЫТ ПЕРАВЫШАЕ ПРАПАНОВУ ЎДВАЯ

Прыкладна з другой дэкады жніўня ў Мінску назіраўся сапраўдны бум актыўнасці студэнтаў на рынку арэнды жылля. Тады за 3 тыдні з рынку былі «павымываныя» ўсе танныя кватэры і асобныя пакойчыкі. У другой палове верасня ў сталіцы назіралася другая хваля максімальнага попыту, калі жыллё пачалі актыўна шукаць сем'і і маладыя спецыялісты, які вырашылі застацца ў галоўным мегаполісе краіны.

Стандартныя кватэры падаражэлі прыкладна на 30—50 долараў

Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва «Дзінас» Іны КУЛЬШЫ**, сёння самыя «слабенькія» па якасці аднапакаёвыя кватэры са старой мэбляй можна адшукаць толькі ў Шабанах і старых дамах Заводскага раёна па кошце 220—240 долараў, хоць яшчэ месяц яны каштавалі да 200 долараў. Цана арэнды стандартных аднапакаёвых кватэр у спальных раёнах пачынаецца ўжо з 250 долараў, а сярэдні кошт арэнды такога жылля ўздоўж лініі метро складае 250—300 долараў.

Крыху лепшыя па якасці аднапакаёвыя кватэры пасля рамонту, з адносна новай мэбляй, тэлевізарам, халадзільнікам і пральнай машынай каштуюць ужо каля 350 долараў (хоць летась арэнда такога жылля была не больш за 280 долараў). Спецыялісты агенцтваў нерухомасці не бачаць падстаў для такога падаражання, бо кватэры такога класа ніколі не здаваліся студэнтам, а прапанаваліся выключна кліентам з сярэднімі даходамі. Аднак, калі попыт на такое жыллё стаў амаль удвая большы за прапанову, тады і цэннік пачаў павялічвацца. Гаспадары якасных хадавых кватэр проста скарысталіся часовай хваляй студэнцкага ажыятажу і штучна павялічылі кошт арэнды.

Самыя танныя двухпакаёвыя кватэры практычна без мэблі магчыма адшукаць цяпер у новабудоўлях за 250—270 долараў. Арэнда стандартнай двухпакаёўкі з мэбляй у спальных раёнах каштуе ўжо 300 долараў. **Мацней усяго падаражэлі звычайныя стандартныя кватэры ў цэнтры Мінска.** Там сёння двухпакаёвыя кватэры з адносна якасным рамонтам, але без «навароту» (а часам і асобныя аднапакаёўкі) прапануюцца ўжо за 400—500 долараў. Такія кватэры здаюцца толькі сем'ям.

Самая дарагая (дарэчы чатырохпакаёвая) кватэра ў Мінску сёння прапануецца па вуліцы Сурганава. Арэнда яе — агульнай плошчай 230 квадратных метраў з джакузі, душкабінай, якаснай замежнай мэбляй і тэхнікай, а таксама з падземным гаражом — каштуе 3 тысячы долараў. Па такім кошце арэнды пад Мінскам магчыма адшукаць даволі якасны катэдж.

Трохпакаёвыя кватэры ў новабудоўлях без мэблі каштуюць 300, у спальных раёнах з мэбляй — каля 350, а ўздоўж лініі метро — 350—400 долараў. Праўда, якасных трохпакаёвак побач з метро цяпер ужо амаль няма.

На рынку існуе невялікі попыт на чатырох- і пяціпакаёвыя кватэры. Стандартныя шматпакаёўкі каштуюць прыкладна каля 400 долараў. У базе агенцтва існуе нават адна чатырохпакаёвая кватэра з рамонтам у Бараўлянах з цэннікам 420 USD.

Не хапае элітных кватэр

Іна Кульша адзначае, што сёння ў Мінску не хапае сапраўды якасных і не вельмі дарагіх кватэр прэміумкласа. У агенцтве цяпер існуюць заказы на стыльныя двухпакаёвыя кватэры ў цэнтры Мінска па кошце 500—700 долараў. Такія кватэры заказваюць кіраўнікі замежных камерцыйных структур (іранцы, кітайцы і расіяне), аднак цэннік элітнага жылля складае ўжо 700—800 долараў. Праўда, і па такім кошце сапраўды якасных кватэр у цэнтры Мінска сёння не хапае.

Самая дарагая (дарэчы чатырохпакаёвая) кватэра ў Мінску сёння прапануецца па вуліцы Сурганава. Арэнда яе — агульнай плошчай 230 квадратных метраў з джакузі, душкабінай, якаснай замежнай мэбляй і тэхнікай, а таксама з падземным гаражом — каштуе 3 тысячы долараў. Па такім кошце арэнды пад Мінскам магчыма адшукаць даволі якасны катэдж.

У лістападзе арэнда павінна патаннець

Наш эксперт агенцтва «Дзінас» паведамляе, што другой хвалі актыўнасці студэнтаў цяпер няма. Можа яе не будзе ўвогуле. Агенцтва не мае ніякіх заявак з боку студэнтаў. Амаль не існуе попыту на асобныя пакоі. Пакойчык на два чалавекі каштуе каля 50—70 долараў для кожнага клієнта, ці 100 долараў за асобнае памяшканне на аднаго. Галоўным чынам жыллё цяпер шукаюць сямейныя пары і новыя супрацоўнікі прыватных кампаній, дзе існуюць нядрэнныя заробкі. Аднак трэба ўлічваць, што кошт арэнды кватэр традыцыйна вызначаецца ў доларах, які ў апошнія часы пачынае набіраць вагу. Больш таго, да кошту арэнды трэба прыплюсоўваць аплату камунальных паслуг, а менавіта ў лістападзе абавязкова пачнецца ацяпляльны сезон. Калі сямейныя пары бліжэй да зімы не змогуць «цягнуць» вялікую арэнду, тады яны зноў пачнуць вяртацца да бацькоў. У гэтым выпадку попыт на кватэры паменшыцца і арэнда можа зноў патаннець прыкладна на 20—30 долараў. Аднапакаёўкі зімой павінны каштаваць каля 200 долараў.

СЛУШНЫЯ ПАРАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТА

- Каб паміж агенцтвам і гаспадаром жылля не ўзнікала спрэчных пытанняў, будучыя арэндадаўцы павінны рэальна ацэньваць свае кватэры.
- Сёння бабулькіны «хрушчоўкі» без рэканструкцыі і рамонту амаль не карыстаюцца попытам у маладых сем'яў і людзей з сярэднімі заробкамі. Цяпер маладыя людзі хочуць здымаць не проста нейкі куток, а сучаснае жыллё, за якое згодныя плаціць добрыя грошы.
- Пасля папярэдніх кватарантаў трэба абавязкова рабіць мінімум касметычны рамонт (паклейка шпалераў, рамонт сантэхнікі).
- Не трэба прапаноўваць кліентам карыстацца тэлевізарам без пультоў кіравання, вельмі маленькімі халадзільнікамі і пральнымі машынамі пазамінулага стагоддзя.
- Пры здачы кватэры студэнтам трэба абавязкова пазнаёміцца і з іх бацькамі, пажадана вырашаць усе спрэчныя моманты менавіта з імі.
- Неабходна заключаць дагавор арэнды ў разліковым цэнтры ЖЭСа. Потым дагавор трэба рэгістраваць у падатковай інспекцыі па месцу свайго жыхарства. Уласнік атрымлівае ўліковы нумар падаткаплацельшчыка і плаціць падатак у памеры адной базавай велічыні (35 тысяч рублёў). За кожны пакой кватэры. У спальных раёнах для такога падатковага збору існуе павышальны каэфіцыент 1,5, у цэнтры — 2, у Заводскім раёне, Шабанах і побач з кальцавой дарогай — 1.

Сяргей КУРКАЧ.

Трагедыя

У БЕЛАРУСІ РАЗБІЎСЯ САМАЛЁТ МІГ-29

23 верасня ў час планавых палётаў разбіўся самалёт МІГ-29 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы ВПС і войскаў ПВА Узброеных Сіл, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства абароны Беларусі.

Інцыдэнт адбыўся пры выкананні элементаў пілатажу павышанай складанасці на малых вышынях. Экіпаж у складзе лётчыка 1-га класа, камандзіра эскадрыллі падпалкоўніка Сяргея Каваленкі і лётчыка 2-га класа, намесніка камандзіра звяна маёра Аляксандра Жыгайлы, прадухіляючы падзенне самалёта на населеныя пункты, адвёў машыну ў раён лясіста-балоцістай мясцовасці, дзе і адбылося крушэнне. Лётчыкі загінулі, да канца выканаўшы свой воінскі і прафесійны абавязак. Заведзена крымінальная справа.

Падпіска-2010

ХТО ШУКАЕ — ТОЙ ЗНАХОДЗІЦЬ

Менавіта так можна сказаць пра нашых падпісчыкаў з Узды Мінскай вобласці Аляксандра Васільевіча і Марыю Пятроўну Кіслых. Больш за трыццаць гадоў яны выпісваюць «Звязду», вельмі часта адпраўлялі на розыгрыш запоўненыя купоны. Думалі, што і апошні «пасыл» будзе халастым. Аднак здарыўся цуд — удача на гэты раз усміхнулася былым настаўнікам матэматыкі, якія зараз на заслужаным адпачынку, і ў якасці прыза выбрала мікрахвалевую печку (фота 1), якую нядаўна супрацоўнікі газеты даставілі на месца пражывання нашых шчасліўчыкаў. Што называецца, хто шукае — той знаходзіць



1.

Сваіх землякоў на раённым вузле паштовай сувязі павіншавалі начальнік РВПС Надзея Левандоўская, кіраўнік ідэалагічнага аддзела райвыканкама Фаіна Жукоўская, работнікі пошты **(фота 2)**.

Удзячныя за дастаўку, звяздоўскія прызёры прынеслі свежы торт. Зразумела, што такі дэсерт лагічней было б уручыць паштавікам, якія з усіх сіл стараюцца падтрымаць старэйшае беларускамоўнае выданне на Уздзеншчыне, што мы з здавальненнем і зрабілі. Глядзіш, і жыццё у работнікаў паштовай сувязі ў гарачы перыяд падпіскі падсаладзілі...

Пасля такой піяр-акцыі мы з задавальненнем накіраваліся па далейшым маршруце. Цёплыя сустрэчы ў Нясвіжы, не менш значныя — у Клецку. Вянчаў усё наш выезд на Міншчыну. Верагодна, таму тут прыйшлося затрымацца. У размове з намеснікам старшыні Клецкага райвыканкама Мікалаем Мацулем высветлілася, што Мікалай Міхайлавіч чытае ўсю рэспубліканскую прэсу. Праўда, «Звязда» яму падабаецца не толькі таму, што ў ёй можна знайсці разнастайную інфармацыю і цікавыя матэрыялы, але і па той прычыне, што дзякуючы нашай газеце ўвесь час будзеш «адукаваным» у плане ведання роднай мовы. «Паход» на мясцовы вузел сувязі ў суправаджэнні супрацоўніцы аддзела ідэалогіі Алены Аляксейчык яшчэ раз пацвердзіў, што мы на правільным шляху. Газету «Звязда» тут любяць і, нягледзячы на адносна невялікую колькасць жыхароў, падпісчыкаў тут вельмі шмат.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Выбары-2010

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДАЎ У ЦВК ЗАЯВУ НА РЭГІСТРАЦЫЮ ІНІЦЫЯТЫЎНАЙ ГРУПЫ

Паводле інфармацыі сакратара Цэнтрвыбаркама Мікалая Лазавіка, сярод патэнцыйных кандыдатаў ёсць і дзейны Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. У Цэнтральную камісію пададзеная заяўка на рэгістрацыю яго ініцыятыўнай групы ў складзе 8403 чалавек, узначаліць якую Аляксандр Радзькоў.

Апошні шанц заявіць пра свае прэзідэнцкія амбіцыі быў ва ўсіх ахвотных учора. Роўна да 19.00 у ЦВК прымалі заяўкі на рэгістрацыю ініцыятыўных груп. Чые прадстаўнікі атрымаюць пасведчанні Цэнтрвыбаркама, а разам з імі і юрыдычную падставу для збору подпісаў, стане вядома ў панядзелак на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі. А ўжо ў наступны чацвер прыхільнікі таго ці іншага патэнцыйнага кандыдата пачнуць збіраць 100 тысяч подпісаў у яго падтрымку — менавіта столькі спатрэбіцца для вылучэння. І часу ў іх на гэта будзе да 29 кастрычніка.

Пакуль жа рэгістрацыяй у Цэнтральнай выбарчай камісіі могуць пахваліцца толькі ўдзельнікі ініцыятыўнай групы Віктара Цярэшчанкі, старшыні савета Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. На чарзе яшчэ 18 заявак. Сярод тых, хто ацэньвае сябе вартым прэзідэнцкага паста, ёсць партыйцы і беспартыйныя, прадпрымальнікі і беспрацоўныя, мужчыны і жанчына. Няхай і не кухарка, але кіраванне дзяржавай лічыць сабе па плячы... санітарка з Гомельшчыны. Самая вялікая «армія» патэнцыйных зборшчыкаў подпісаў пакуль налічвае 10 483 чалавекі — у лідара ЛДП Сяргея Гайдукевіча. Самая малая — аднаго, у асобе патэнцыйнага прэтэндэнта, беспрацоўнага Ілыі Дабратворца (пры мінімальна дапушчальнай заканадаўствам колькасці ў 100 чалавек).

Тым часам інтарэс да выбараў праяўляюць міжнародныя назіральнікі. Тэхнічная група экспертаў АБСЕ наведае Беларусь 26 верасня. Каб ацаніць, колькі назіральнікаў спатрэбіцца для маніторынгу прэзідэнцкай кампаніі ў нашай краіне. Прадстаўнікі місіі СНД пацвярджаюць гатоўнасць скіраваць у першых доўгатэрміновых назіральнікаў у самы блізкі час.

Зоя ВАРАНЦОВА.

«ГАЛОЎНАЙ МЭТАЙ ЛЮБОГА КІРАЎНІКА ПАВІНЕН БЫЦЬ КЛОПАТ ПРА ЛЮДЗЕЙ І ІХ ДАБРАБЫТ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт падкрэсліў, што, калі б ён бачыў, што навучальная ўстанова рыхтуе свяцілаў і з яе сцен выходзяць сапраўдныя «брыльянты», то акадэмгарадок быў бы даўно пабудаваны. «Мне здаецца, што акадэмія працуе сёння так, як і іншыя ВНУ», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Перад вамі была пастаўлена задача адабраць унікальных хлопцаў і дзяўчат — супердзяцей — і тут іх навучаць. Гэта заўтрашнія прэзідэнты краіны, міністры. Іх відаць ужо ў школе. Яна павінны быць усебакова развітымі людзьмі, гатовымі заўтра павесці за сабой масы», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да рэктара акадэміі.

Аднак, прадоўжыў Прэзідэнт, для такіх студэнтаў і слухачоў патрэбны і высокапрафесійны прафесарска-выкладчыцкі склад. У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў час рабочай паездкі ў Мінскую вобласць 23 верасня ён сустракаўся з кіраўнікамі гаспадарак і прадпрыемстваў, раёна і вобласці, якія, на яго думку, з'яўляюцца сапраўднымі прафесіяналамі сваёй справы. «Хто ім павысіць іх кваліфікацыю? — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі пры падборы і расстаноўцы кадраў дзейнічаюць прынцыпы выкаранення кумаўства, кланавасці і зямляцтва.

«Скажу шчыра, я сам сутыкнуўся з гэтай праблемай з першых дзён прэзідэнцтва, калі частка людзей, якія падтрымлівалі мяне ў перадвыбарную кампанію ў 1994 годзе, на наступны дзень пасля майго выбрання прыйшлі да мяне за партфелямі. Яны ўжо размеркавалі паміж сабой кіраўніцкія крэслы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Але тады Прэзідэнт сказаў, што пасады будуць толькі па здольнасцях.

Звяртаючыся да студэнтаў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што выказванне «падбор і расстаноўка кадраў, можа, і аддае кансерватызмам, але на самай справе размова ідзе аб важнейшай, калі не ключавой, функцыі кіравання».

«Для мяне яна асабліва важная і адказная, паколькі ў Беларусі Прэзідэнт надзелены вялікімі паўнамоцтвамі. На маім узроўні назначаецца вельмі шмат службовых асобаў. Хтосьці можа падумаць, што ўсё гэта лішні раз падкрэслівае ўладалюбства Лукашэнкі. Але якраз з пункту гледжання публічнай палітыкі гэта не вельмі выгадна Прэзідэнту, і я гэта разумею як ніхто іншы. Таму што за кожнага чалавека, якога назначае асабіста Прэзідэнт, менавіта ён і нясе адказнасць», — падкрэсліў ён.

«Не думаю, што трэба мяняць напрамак знешняй палітыкі, — сказаў Прэзідэнт. — Мы намацалі правільны напрамак знешняй палітыкі — шматвектарнасць». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь пры выбудоўванні знешняй палітыкі зыходзіць з таго, што яе інтарэсы не павінны быць на шкоду суседнім дзяржавам і ўсяму свету. «Мы ні з кімваяваць не будзем», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў: «Мы вельмі акуратныя ў адносінах да сваіх суседзяў і праводзім такую палітыку, каб яна не была на шкоду ім».

Разам з тым Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што «мы неяк нахіліліся на адно крыло», маючы на ўвазе расійскі напрамак. Ён растлумачыў гэта блізкасцю двух народаў. «Мы выбудоўвалі свае адносіны, перш за ўсё, на ўсходнім напрамку, але да чаго гэта прывяло з-за той палітыкі, якая праводзіцца расійскім кіраўніцтвам, вы бачыце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі б Венесуэла нам у гэтым годзе не дапамагла, нам было б цяжка, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Яны нас проста выратавалі». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, «мы займаемся многімі праектамі, і Венесуэла прадае нам нафту на нармальных умовах».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні студэнтаў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, паведаміў, што не збіраецца ствараць асабісты блог, а для інфармавання людзей аб яго дзейнасці існуе афіцыйны сайт кіраўніка дзяржавы.

«Пра асабісты блог я не думаю і не збіраюся яго ствараць, таму што мне гэта проста не патрэбна, — сказаў Прэзідэнт. — А паказаць, які я дасведчаны... Не хочацца мне паказухай займацца». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў аснове яго палітыкі шчырасць і справядлівасць.

На думку Прэзідэнта, наша краіна прайшла перыяд станаўлення і стаіць на парозе якасна новага этапу развіцця. «Размова не аб змене курсу, не аб павароце або развароце, а аб фарсіраваным руху наперад, імклівым рыўку», — сказаў ён.

«Але цяпер ужо мала простага падзвігу асобных прадпрыемстваў або галін. Беларусь мае патрэбу ў з'яўленні новых галін эканомікі, заснаваных на ведах, інфармацыйных тэхналогіях і звязаных на свае рэсурсы», — лічыць кіраўнік дзяржавы. На яго думку, такімі рэсурсамі з'яўляюцца лес, дрэваапрацоўка, пітная вада. Акрамя таго, Беларусь можа больш эфектыўна выкарыстоўваць другасную сыравіну.

«Нам трэба падзарнізавацца і мяняць твар эканомікі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Вырашым некалькі стратэгічных задач, адыдзем ад залежнасці па вуглевадародах і гэтак далей — значыць, мы застанёмся як дзяржава. Не — будзем на другарадных ролях, плесціся ў хвасце і думаць: «Ну возьмуць нас у Еўрасаюз, якую-небудзь падачку кінуць — добра. Ну, можа, як нам нейкі лідар прапаноўваў, унутр Расіі ўвайсці, можа, таксама будзе добра». А не хацелася б, каб перад нашай дзяржавай стаяў толькі такі выбар і такая альтэрнатыва», — адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што «шчасце трэба шукаць у сябе». «Нават калі будзе цяжка, складана, я заўсёды папярэджваў, вы хочаце незалежнасці, а за яе трэба дорага плаціць. І ўсе дзяржавы вельмі дорага за яе плацілі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Дзяржаўная праграма па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй на 2010—2012 гады зацверджана ў Беларусі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 23 верасня 2010 года выдаў указ № 485, якім зацверджана Дзяржаўная праграма па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй на 2010—2012 гады.

Новая праграма прадугледжвае комплекс мераў у сферы барацьбы са злачыннасцю і карупцыяй, уключаючы арганізацыйна-прававыя і практычныя меры, мерапрыемствы па процідзеянні асобным відам злачынстваў (эканамічным, карупцыйным, а таксама арганізаванай, рацыдыўнай злачыннасці, тэрарызму і экстрэмізму); актыўны ўдзел у мерапрыемствах у сферы процідзеяння злачыннасці і карупцыі не толькі праваахоўных, але і вышэйшых судовых органаў, Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Нацыянальнага банка, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання.

Дзяржаўнай праграмай вызначаны ключавыя мерапрыемствы: арганізацыя на рэспубліканскім і рэгіянальным узроўнях маніторынгу крымінагеннай сітуацыі і справаздачнасці аб мерах па яе паляпшэнні, маніторынгу грамадскай думкі аб рабоце праваахоўных, кантралюючых органаў і судоў, а таксама маніторынгу існуючых праблем у галіне арганізацыі і вядзення бізнэсу; сістэмнае правядзенне праверак выканання антыкарупцыйнага заканадаўства ў дзяржаўных органах і іншых арганізацыях; прапрацоўка прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства аб дзяржаўнай службе, у тым ліку аб мэтазгоднасці зацвярджэння зводу нормаў службовай этыкі дзяржаўных служачых; падрыхтоўка прапаноў аб дыферэнцыяцыі аплаты працы дзяржаўных служачых у залежнасці ад узроўню дзяржаўных органаў і ступені адказнасці за прымаемыя рашэнні; прыняцце мераў па скарачэнні чарговасці ў жылёвай і іншых матэрыяльных сферах, паляпшэнні якасці медыцынскага абслугоўвання і іншых сацыяльных паслуг у мэтах павышэння сацыяльных стандартаў жыцця грамадзян і прафілактыкі правапарушэнняў, забеспячэнне максімальнай публічнасці прымаемых рашэнняў у сферах прыватызацыі, арэнды дзяржаўнай маёмасці, дзяржаўных закупак, прадастаўлення зямельных участкаў, сацыяльнага і службовага жылля; выпрацоўка дзейсных прапаноў па процідзеянні рэйдарскім захопам арганізацый і іншым злоўжыванням у сферы прадпрымальніцкай дзейнасці; распрацоўка сістэмы мераў па стымуляванні арганізацый, якія ствараюць рабочыя месцы для працаўладкавання грамадзян, вызваленых з папраўчых устаноў, у тым ліку адкрытага тыпу, і арыштных дамоў; аснашчэнне праваахоўных і кантралюючых органаў, судоў сучаснымі відамі спецыяльнай тэхнікі і абсталявання, укараненне ў іх дзейнасць новых праграмна-тэхнічных сродкаў і інфармацыйных сістэмаў; прыняцце мераў па пашырэнні свабоднага доступу насельніцтва да нарматыўных прававых актаў і іншай інфармацыі прававога характару...

Кантроль за выкананнем зацверджанай гэтым указам дзяржпраграмы па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй будзе ажыццяўляцца Генеральнай пракуратурай і Саветам Міністраў Беларусі.

Функцыі каардынатара дзяржаўнай праграмы ўскладзены на рэспубліканскую каардынацыйную нараду па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй, якую ўзначальвае генеральны пракурор. Ён штогод да 1 красавіка павінен інфармаваць кіраўніка дзяржавы аб ходзе выканання дзяржаўнай праграмы.

Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

СЕМ БЕЛАРУСКІХ МУЛЬТФІЛЬМАЎ НА «АНІМАЁЎЦЫ-2010»

У Магілёўскай вобласці адкрыўся XIII Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў.

На магілёўскую «Анімаёўку» прадставілі свае творы 35 студый з 19 краін свету. Упершыню ў праграмах фестывалю з'явяцца работы анімататараў Венгрыі, Чэхіі і Башкартастана. У конкурснай праграме бяруць удзел адразу 7 беларускіх мультфільмаў, 5 з якіх выкананыя на беларускай мове. Журы сёлета ўзначальвае мастацкі кіраўнік «Беларускага відэацэнтра» Аляксандраў Карпаў. «Анімаёўка» працягнецца да 30 верасня. Фестывальныя мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх раённых цэнтрах вобласці, а ў кінатэатрах Магілёва штодня будуць дэманстравацца праграмы мультфільмаў для дзяцей.

Ілона ІВАНОВА.

УПАЎ ДЭЛЬТАЛЁТ

Каля вёскі Вялікія Якавічы Пружанскага раёна падчас трэніровачнага палёту ўпаў дэльталёт, які належыць ААТ «Пружаны Авіяхімсэрвіс». На шчасце, 26-гадовы пілот атрымаў траўмы, якія не ўяўляюць пагрозу для жыцця, бо дэльталёт не паспеў узняцца на вялікую вышыню. Праводзіцца праверка прычын аварыі.

Яна СВЕТАВА.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	IV квартал
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

ТОЛЬКІ ФАКТЫ

Праграма развіцця ААН (ПРААН) апублікавала чарговы, за 2009 год, **Даклад аб развіцці чалавека** ў свеце. Згодна з ім, Беларусь займае 68-е месца — **самае высокае сярод краін СНД** — па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу сярод 182 дзяржаў свету і ўваходзіць у **групу краін з высокім узроўнем** развіцця чалавечага патэнцыялу.

Рэйтынг краін СНД па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу



Узровень дзіцячай смяротнасці і працягласць жыцця як найважнейшыя фактары стану здароўя насельніцтва

У апошнія гады, як паказваюць звесткі статыстыкі, у Беларусі значна палепшыліся многія дэмаграфічныя паказчыкі. Напрыклад, узровень дзіцячай смяротнасці ў 2009 годзе ў параўнанні з 1995 годам знізіўся ў 2,8 раза, у параўнанні з 2005-м — у 1,5 раза. Летась **каэфіцыент смяротнасці сярод немаўлят** (колькасць дзяцей, якія памерлі ва ўзросце да 1 года на 1000 народжаных) склаў 4,7 і **быў самым нізкім сярод краін СНД**. Для параўнання:

Казахстан	18,2	Арменія	10,4
Малдова	12,1	Украіна	9,4
Азербайджан	11,3	Расія	8,1

Значна знізілася ў Беларусі і **мацярынская смяротнасць — яе ўзровень у нас таксама з'яўляецца самым нізкім у СНД**. Так, у 2009 годзе каэфіцыент мацярынскай смяротнасці ў параўнанні з 1995 годам зменшыўся ў 14 разоў, у параўнанні з 2005 годам — у 10 разоў. Летась на 100 000 дзяцей, якія нарадзіліся жывымі, у рэспубліцы зафіксаваны толькі 1 выпадак смерці жанчыны ў выніку ўскладненняў цяжарнасці, родаў і паслядавага перыяду, тады як у Казахстане — 37, Арменіі — 27, Украіне — 26, Азербайджане — 24, Расіі — 22, Малдове —17.

Важнейшым індыкатарам стану здароўя насельніцтва з'яўляецца **чаканая працягласць жыцця**. Летась у Беларусі яна склала 70,5 года, у тым ліку ў мужчын — 64,7 года, у жанчын — 76,4 года. У параўнанні з 1995 годам чаканая працягласць жыцця павялічылася на 1,9 года, з 2005-м — на 1,7 года. Працягласць жыцця мужчын у Беларусі вышэй, чым у Расіі, Украіне, Казахстане, Кыргызстане, а па чаканай працягласці жыцця жанчын наша краіна саступае толькі Арменіі.

Караць нельга памілаваць

ВЫКЛЮЧНУЮ МЕРУ АДМЕНЯЦЬ

Пытанне толькі калі...

Ала МАЧАЛАВА

Савету Еўропы прасцей — ён ужо даўно вызначыўся: смяротная кара непрымальная. І гэта догма, якая не абмяркоўваецца. Беларусь усё яшчэ ўзважвае — у атачэнні 47 краін, якія лічаць найвышэйшай каштоўнасцю жыццё чалавека. Кожнага. Любога. Не бяруся ацэньваць маштаб і актыўнасць дыскусіі, распачатай з утварэннем парламенцкай рабочай групы па вывучэнні каверзнай праблематыкі. Скажу толькі, што днямі яна атрымала новы віток. Дзякуючы «кругламу сталу», арганізаванаму па ініцыятыве Савета Еўропы.

Асабістая справа

Праваахоўнікі найперш турбуюцца пра крымінагенную абстаноўку ў краіне, палітыкі мысляць міждзяржаўнымі маштабамі. Аднак усе яны — па сутнасці, пабочныя назіральнікі, якіх праблема кранае толькі па абавязку службы. А вось сярод экспертаў СЕ, што селі за стол перамоў з прадстаўнікамі беларускіх улад, ёсць жанчына, для якой барацьба са смяротнай карай — справа асабістая. Так забілі яе сына... Гэта адбылося ў 1999 годзе ва Узбекістане, дзе выключная мера была адменена дзевяццю гадамі пазней.

— Смяротная кара — гэта **наўмыснае забойства чалавека дзяржавай**, — даводзіць Тамара ЧЫКУНОВА, якая верыць у невінаватасць свайго сына.

Яна перакананая, што выключная мера пакарання не ўсталёўвае справядлівасць, а толькі параджае жорсткасць. Эксперт СЕ акцэнтуе **незваротнасць** смяротнай кары і ўказвае на магчымасць **судовай памылкі**.

— Першая мэта крымінальнага пакарання — раскаянне, выпраўленне, рэабілітацыя перад грамадствам. Смяротная кара пазбаўляе такой магчымасці, — кажа заснавальніца арганізацыі «Мацеры супраць смяротнай кары і катаванняў».

Яна заклікае задумацца і пра тое, што, «калі караем смерцю злачынцу, **не адраджаем ахвяру**». Дык нашто тады адбіраць жыццё ў злачынцы і тым самым да яго прыпадабняцца? У мяне асабіста няма адказу на гэта пытанне...

Т.Чыкунова ўпэўненая, што грамадства павінна валодаць поўнай інфармацыяй пра смяротную кару і яе наступствы. Бо калі санкцыянаванае забойства здзяйсняецца, па сутнасці, з нямой згоды грамадзян, кожны з іх мае да гэтага дачыненне. І варта найперш сабе самому адказаць на пытанне: «Ці маю я права пазбаўляць чалавека жыцця?»...

Прыкметная фігура ў юрыдычных колах, **Роберт БАДЗІНТЭР (экс-міністр юстыцыі і старшыня Канстытуцыйнага Савета Францыі, а сёння сенатар парламента),** чыё імя фактычна асацыюецца з ідэяй барацьбы са смяротнай карай, падчас «круглага стала» ў Мінску выступіў з праграмнай прамовай «За ўсеагульную адмену». На гэты шлях яго таксама прывяло асабістае (што адчуваецца і ў палкасці выступлення). Пакаранне смерцю ўласнага падабароннага. Той удваіх з іншым зняволеным учыніў бунт у турме — узяў у заложнікі вартаўніка і медсястру. І хоць падабаронны Бадзінтэра іх не забіваў (ідэя і выкананне — яго саўдзельніка), аднак на гільяціну выправілі абодвух. Адваката ўзрушыла і абурыла, што чалавека, які нікога не забіў, пазбавілі жыцця. Гэта было ў 1972 годзе, і з таго часу Бадзінтэр стаў заўзятым змагаром за адмену смяротнай кары. «Я ніколі не прыму правасуддзе, якое забірае жыццё чалавека, разразаючы яго на дзве часткі», — дзеліцца ён сваімі тагачаснымі ўражаннямі цяпер, знаходзячыся ў Беларусі. Якая для яго, трэба думаць, бы стрэмка: толькі яна не дае сказаць, што ўвесь кантынент удалося вызваліць ад лютай кары. Ён націскнуў і на самы моцны беларускі аргумент, якім з'яўляецца грамадская думка. Юрыст адзначыў, што яна не статычная, і прывёў у пацвярджэнне лічбы, як змянілася стаўленне людзей у краінах, дзе выключная мера была адменена. Напрыклад, Францыя. Калі напачатку 64 адсоткі выказваліся адназначна «за» смяротную кару і толькі 36 — «супраць», то пасля пройдзенага шляху, растлумачальнай работы карціна змянілася. Сёння за аднаўленне смяротнай кары выказваецца толькі 32 адсоткі.

Пра ключавыя беларускія аргументы (якія на Захадзе, відаць, уяўляюцца адгаворкамі) казаў і **Філіп БААЯ, генеральны дырэктар па правах чалавека і юрыдычных пытаннях Савета Еўропы**. Маўляў, ведае ён, і пра грамадскую думку ў Беларусі, настроеную на захаванне смяротнай кары, і пра рэферэндум, які неабходна праводзіць для прыняцця рашэння. На гэта ў яго ёсць што запярэчыць:

— Гэта пытанне волі палітычных лідараў. Якраз тая сітуацыя, калі яны павінны весці, а не быць вядзёнымі большасцю. Гэта не азначае ігнараваць меркаванне грамадства, а быць дастаткова смелым, мужным, каб адстаяць каштоўнасць чалавечага жыцця.

Выйсцем, на яго думку, магло б стаць рашэнне кіраўніка дзяржавы і парламента. У гутарцы з беларускімі журналістамі ён абверг чуткі аб зборы подпісаў за вяртанне смяротнай кары ў Швейцарыі. Паводле яго слоў, такую ініцыятыву праявілі чатыры чалавекі (маўляў, на сем мільёнаў насельніцтва), і для рэалізацыі канстытуцыйнай ініцыятывы патрэбныя юрыдычныя абгрунтаванні. Праз тры дні запыт быў адкліканы. Аднак сам факт спадар Баая ацэньвае як шакіруючы, і ўспрымае яго як нагоду весці бязупынную асветніцкую работу — «пераконваць людзей, што адмена смяротнай кары абгрунтаваная». Ён прызнае, што адразу пасля бязлітасных забойстваў і згвалтаванняў эмацыйна ўзрушанае грамадства можа хацець смерці для забойцы. Аднак з цягам часу на змену эмоцыям павінна прыйсці разуменне, што так праблему не вырашыць і зло не выкараніць. Насамрэч, хіба можа стрымліваць злачынцу наяўнасць лютай кары? Ён папросту спадзяецца, што яго не зловяць...

Гендырэктар па правах чалавека і юрыдычных пытаннях Савета Еўропы не назваў журналістам пакарання, якое магло б стаць заменай выключнай меры. Пажыццёвае зняволенне, напрыклад, ён не лічыць годнай альтэрнатывай.

— Мы павінны знайсці рашэнне, якое дазволіць поўнасцю выканаць правы чалавека і захаваць бяспеку грамадства. У кожным канкрэтным выпадку юрысты, псіхолагі, медыкі павінны вызначаць, ці можа чалавек вярнуцца ў грамадства, — мяркуе спадар БААЯ.

У цэлым, паводле слоў гасцей, Савет Еўропы вітае стварэнне парламенцкай рабочай групы ў Беларусі, разгорнутую дыскусію і верыць у тое, што час, калі Беларусь зможа далучыцца да еўрапейскай сям'і ў плане адмены смяротнай кары, блізкі як ніколі.

Справа дзяржаўная

Пакуль беларусы задумваюцца, аналізуюць і сумняваюцца, судовая сістэма спраўна выносіць прысуды, і яны прыводзяцца ў выкананне. Аргументаў «за» таксама хапае. Асаблівую вагу яны могуць набыць, калі гучаць з вуснаў **міністра юстыцыі Віктара ГАЛАВАНАВА**. Падчас дыскусіі ён, напрыклад, выказаў думку, што «чым больш цэніцца чалавечае жыццё, тым больш суровым павінна быць пакаранне за яго пазбаўленне». Змякчэннем пакарання, на яго думку, «ускосна заахвочваецца цярпімасць да злачынстваў».

— Тэрарысты пазбаўляюць жыцця тысячы людзей, але самі пры гэтым маюць права на жыццё. Дзе логіка? — задаецца пытаннем кіраўнік ведамства.

Ён лічыць, што пры такім раскладзе **«атрымліваецца, нібы права на жыццё бязвінна забітага менш каштоўнае, чым права на жыццё злачынцы»**. Міністр мяркуе таксама, што быць праціўнікам смяротнай кары становіцца модным:

— Хто за адмену смяротнай кары — той дэмакрат, хто супраць адмены — той рэтраград.

В. Галаванаў перакананы, што «**дэмакратычная дзяржава не ў праве ігнараваць меркаванне народа**». 80,44 адсотка — ці не галоўны сцяг схільных захаваць выключную меру пакарання. Менавіта столькі беларусаў прагаласавала за гэта на рэферэндуме ў 1996 годзе. Аднак з тых часоў змянілася, па-першае, крымінальнае заканадаўства (з'явілася, напрыклад, пажыццёвае зняволенне). Па-другое, структура насельніцтва: цяперашняя па-грамадзянску актыўная моладзь тады яшчэ не магла галасаваць...

Кіраўнік Міністэрства юстыцыі не думае, што смяротная кара вырашыць праблему злачыннасці. Аднак і адмова ад яе, на яго думку, магчымая толькі шляхам пошукаў, скарачэння маштабаў прымянення выключнай меры, паступовай замены пажыццёвым зняволеннем, якое не прадугледжвала б права на датэрміновае вызваленне. І «круглы стол», які адбыўся, уяўляецца яму «адной з тых гірак, якія схіляюць грамадзян Беларусі на бок праціўнікаў смяротнай кары».

Мікалай САМАСЕЙКА, кіраўнік парламенцкай рабочай групы па вывучэнні праблематыкі смяротнай кары, старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях перакананы: «у спрэчцы паміж прыхільнікамі і праціўнікамі смяротнай кары пераможцы быць не можа». Тут вельмі шмат нюансаў, і многія з іх ляжаць у маральна-духоўнай сферы. Ён прызнае, што ўнутрыдзяржаўны аспект праблемы цесна пераплятаецца са знешнепалітычным. Відавочна, што са смяротнай карай у Савет Еўропы нам дзверы зачыненыя... Аднак знешні фактар, на думку дэпутата, «не павінен і не можа з'яўляцца вырашальным», у той жа час «і не прымаць яго ў разлік было б палітычна няправільна». Выйсце трэба шукаць, на яго думку, «зыходзячы з інтарэсаў грамадства».

— Не выключае сумненняў, што смяротная кара будзе адменена, — канстатуе М. Самасейка, спасылаючыся на часовы ае характар, замацаваны ў Крымінальным кодэксе і Асноўным законе краіны, і дадае, што пытанне толькі ў тым, калі гэта здарыцца. — Прагназаваць я не бяруся. Сказаць, адбудзецца гэта праз тыдзень, год ці 10 гадоў, нельга. Аднак Беларусь ушчыльную падышла да вырашэння гэтага пытання.

Генпракурор Беларусі Рыгор ВАСІЛЕВІЧ таксама бачыць патрэбу ў часе на роздум. Ён заўважае, што Еўропе на поўную адмову ад смяротнай кары спатрэбілася 53 гады (роўна столькі прайшло ад падпісання Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека да з'яўлення пратакола № 13 да яе, які адмяняе смяротную кару ў любых абставінах). Гэта не было імгненным рашэннем. Беларусь, паводле яго слоў, рухаецца па шляху скарачэння колькасці злачынстваў, за якія можа быць прысуджаная выключная мера. І ўвогуле адзначаецца тэндэнцыя да «аздараўлення атмасферы»: людзі ўсё радзей прыбягаюць да гвалту, высвятляючы адносіны. А гэта і ёсць найбольш распаўсюджаныя забойствы (на побытавай глебе), бо заказных у нас няма. Зніжаецца і колькасць смяротных прысудаў:

— Калі ў 1997—1998 гадах іх было больш за 40, то ў апошнія гады стала істотна менш: па два ў мінулым і пазамінулым годзе.

Застаецца толькі спадзявацца, што нам не давядзецца чакаць гуманізацыі крымінальнага заканадаўства яшчэ 53 гады...

Абзац

У Бабруйску выберуць залатую цешчу. Тытул «Залатая цешча» аспрэчаць шэсць жанчын. Папулярны сярод гараджан конкурс пройдзе ў гарадскім парку ў восьмы раз. Ён прымеркаваны да Дня пажылых людзей, да ўдзелу дапускаюцца цешчы ад 40 гадоў і старэй.

Поўны абзац

Незвычайная, экзатычная выстава малюнкаў адкрылася ўчора ўпершыню ў Музеі Сусветнага акіяна ў Калінінградзе. Стваральнікамі 20 мастацкіх палотнаў, што прадстаўленыя ў экспазіцыі, з'яўляюцца дэльфіны — насельнікі Марскога музея Літвы. Для выставы выбраныя, па словах арганізатараў, самыя яркія і выразныя працы, што створаныя пяццю дэльфінамі за апошнія 3 гады. У кожнага «мастака» — свой характар, свой эмацыйны вопыт, якія адлюстраваныя ў творчасці гэтых марскіх млекакормячых.

Кароль Свазіленда Мсваці III адправіў у адстаўку міністра юстыцыі краіны Ндуміса Мамбу за сувязь з адной са сваіх 14 жонак. Міністр быў злоўлены ў ложку 12-ай жонкі афрыканскага правіцеля некалькі дзён таму: Мамба хаваўся ў матрацы двухспальнага ложку каралевы. У хуткім часе пасля інцыдэнту прэм'ер-міністр краіны правёў кароткую прэс-канферэнцыю, на якой было аб'яўлена, што Мамба зняты з займаемай пасады. Прычыну старшыня ўрада называць не стаў. Мяркуецца, што за сувязь з жонкай караля цяпер ужо былы міністр юстыцыі будзе адпраўлены ў турму. Жонка, якая правінілася, будзе жыць у доме маці караля.

На адным з пляжаў іспанскага вострава Тэнэрыфе засыпала пяском 23-гадовага турыста з Нямеччыны. Аперацыя па выратаванні маладога чалавека працягвалася каля дзвюх гадзін. Хлопец капаў на пляжы трохметровы тунэль, які абваліўся, і чалавек аказаўся пахаваным пад пясчанай канструкцыяй. Выратавальнікаў выклікала дзяўчына пацярпелага. На месца здарэння прыбыло 15 выратавальных машын, верталёт і 15 пажарных. У выратавальнай аперацыі прынялі ўдзел і наведвальнікі пляжа. У выніку ўдалося дапамагчы немцу выбрацца на паверхню. Выратавальная аперацыя абышлася ў 20 тыс. еўра.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

31.10.210 г.
состоится внеочередная конференция
ОО «Белорусская Федерация танцевального спорта»,
по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 79, кор. 2, начало 10.00.
Тел. для справок 8 029 615 33 10.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СМІ: БАТУРЫНА ПЕРАВОДЗІЦЬ СЯМЕЙНЫ БІЗНЭС У АЎСТРЫЮ

Жонка мэра Масквы Юрыя Лужкова, кіраўнік кампаніі «Інтэка» Алена Батурына паслядоўна пераводзіць свой бізнэс у Аўстрыю, робіць выснову французская газета L'Express, якая праводзіла ўласнае расследаванне.

Яшчэ два гады таму Батурына пачала прадпрымаць актыўныя крокі ў гэтым кірунку, заснаваўшы фонд у Вене, які дазваляе ёй плаціць падаткі ад дзейнасці ў сферы бізнэсу ў аўстрыйскі бюджэт. Летась яна набыла за 25 млн еўра шыкоўны гасцінічны комплекс у адным з найбагацейшых месцаў аўстрыйскіх Альп — Кітцбюэле, дзе любяць адпачываць рускія алігархі і прэм'ер Пуцін. Каб заваяваць добразычлівасць аўстрыйцаў і зменшыць крытычныя выбрыкі ў мясцовых СМІ ў адрас рускіх, Батурына і Лужкоў штогод бязвыплатна выдзяляюць мільёны еўра на правядзенне спартыўных мерапрыемстваў і культурных фэстаў у Ціроле. У пятніцу ўвечары стала вядома, што Алена Батурына падае ў суд на французскае выданне L'Express за артыкул.

ПРЭЗІДЭНТ ІРАНА: ЗА ТЭРАКТАМ 9/11 СТАЯЛІ «НЕКАТОРЫЯ ЛЮДЗІ З АМЕРЫКАНСКАГА ЎРАДА»

Прамова ў ААН Махмуда Ахмадзінежада прымусіла пакінуць залу пасяджэнняў прадстаўнікоў ЗША і іншых краін.

Падчас свайго выступлення на пасяджэнні Генасамблеі ААН прэзідэнт Ірана закрануў тэму тэракту 9/11 і назваў тры версіі, якія, паводле яго меркавання, з'яўляюцца асноўнымі. У прыватнасці, ён выказаў здагадку, што за маштабным нападам стаялі «некаторыя людзі з амерыканскага ўрада», якія хацелі такім чынам «выратаваць ад падзення сусветную эканоміку...» Акрамя таго, ён адзначыў, што Вашынгтон выкарыстаў тэракт у якасці падставы для пачатку вайны ў Афганістане і Іраку. Пасля гэтых слоў залу пасяджэння пакінулі прадстаўнікі ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і яшчэ некалькіх краін.

РАСІЯ ЗНЯЛА ПОШЛІНЫ НА ГРЭЧКУ І БУЛЬБУ

Падкамісія ўрада Расіі па мытна-тарыфным рэгуляванні вырашыла часова адмяніць пошліны на ўвоз бульбы, капусты і грэчкі. Абнуленыя пошліны будуць дзейнічаць як мінімум шэсць месяцаў.

Рашэнне было прынята з улікам зніжэння аб'ёмаў вытворчасці гэтай прадук

ЭХ, ДАЖЫНАЧКІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

...Тым часам, пакуль карэспандэнт «Звязды» аглядаў некаторыя з вышэйзгаданых аб'ектаў, а таксама арганізаваную Міністэрствам прамысловасці выставу сельскагаспадарчай тэхнікі, у Лідзе ўжо ўзяліся за справу зазывалы. Па вуліцах горада з запрашэннем на Дажынкі раз'язджала пяць конных экіпажаў, у кожным з якіх было па пяць-шэсць дзяўчат і мужчын у нацыянальных строях, з гармонікамі і, зразумела, з добрымі галасамі. Зазывалаў падтрымалі духавыя аркестры. Крыху пазней на сцэнічных пляцоўках горада распачаліся канцэртныя выступленні з удзелам творчых калектываў не толькі Гродзеншчыны і іншых рэгіёнаў нашай краіны, але і беларускіх калектываў з Клайпеды, Львова... На бульвары Гедыміна разгарнуўся «Горад майстроў» са сваімі вуліцамі, завулкамі і нават «Праспектам рамеснікаў». Во дзе сапраўднае суквецце талентаў!

На стадыёне, лыжаролернай трасе і ў Лядовым палацы сваё фізкультурна-спартыўнае «прывітанне» святу працаўнікоў вёскі накіроўвалі ўдзельнікі лёгкаатлетычнай эстафеты, майстры сілавога шматборства, лыжаролеры, футбалісты, хакеісты, барцы, аматары коннага спорту... Для дзяцей падрыхтавалі «Планету забаў» — гульні, атракцыёны, віктарыны.

Што датычыцца «дажыначных» гандлёвых радоў, то іх агульная колькасць, паводле папярэдніх ацэнак, складала сем кіламетраў, свае прамысловыя і харчовыя вырабы, паслугі прапанавала каля трохсот прадпрыемстваў з усёй краіны. Напрыклад, на вуліцы Савецкай спажыўкааперацыя падрыхтавала для гурманаў стравы дзесяці кухняў народаў свету. Для жыхароў і гасцей горада ў гэтых радах арганізавалі больш за 8 тысяч пасадачных месцаў, прычым шмат дзе запрашалі не толькі атаварыцца, але і прадэгуставаць прадукцыю, ладзілі розныя акцыі. Прадпрыемствы бытавога абслугоўвання дэманстравалі мадэлі адзення, прычоскі. А Міністэрства сувязі і інфарматызацыі прымеркавала да «Дажынак-2010» выпуск у абарачэнне маркі «Герб Ліды» (леў з ключамі) з серыі «Гербы гарадоў Беларусі» тыражом 45 тысяч экзэмпляраў. Учора ў лідскім аддзяленні паштовай сувязі № 11 і ў месцах выязнога гандлю праводзілася спецыяльнае гашэнне на канверце.

Канцэрты і спартыўныя спаборніцтвы доўжыліся да вечара, а ў сярэдзіне дня галоўнай падзеяй, зразумела, было шэсце ўдзельнікаў свята да галоўнай пляцоўкі і ўрачыстае адкрыццё фестывалю з уручэннем другіх і трэціх прэмій пераможцам Рэспубліканскага спаборніцтва на ўборцы сёлетняга ўраджаю. Дарэчы, калону ўдзельнікаў свята (сярод якіх былі і «дэбютанты» рэспубліканскага свята, і такія «старажылы», як механізатар ААТ «1-я Мінская птушкафабрыка» Аляксандр Стасюлевіч і вадзіцель прадпрыемства «Дубна» ААТ «Гроднахлебапрадукт» Мастоўскага раёна Міхаіл Дабрук, якіх адпаведна ў шосты і пяты раз запрасілі на рэспубліканскія Дажынкі) «узначаліў»... святочны бохан памерам паўтара метра на метр, спечаны, вядома ж, са знакамітай лідскай мукі.

Лепшых працаўнікоў вёскі павіншаваў намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, старшыня аргкамітэта па правядзенні Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2010» Іван Бамбіза. Ён адзначыў, што «складана размеркаваць лідараў спаборніцтваў па першым, другім і трэцім месцы, усе яны працавалі выдатна і заслугоўваюць шчырай падзякі». Ён дадаў, што якімі б ні былі падарункі для герояў Дажынак — іх недастаткова. А лепшай узнагародай для працаўнікоў стануць эканамічныя дасягненні краіны. «Калі мы штогод будзем павялічваць дабрабыт кожнага, хто пражывае ў рэспубліцы, дык гэта і стане лепшым падарункам», — падкрэсліў ён.

А затым Ліда зноў зачароўвала спевамі, танцамі, мастацкімі выставамі, а таксама сярэднявечным фэстам «Меч Лідскага замка» з удзелам лепшых байцоў Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы і гуртоў старажытнай музыкі. У двары замка Гедыміна, на рэстаўрацыю якога таксама затрачана шмат «дажыначных» грошай, размясціліся рыцарскі стан, рамесны рад, гістарычныя атракцыёны (стральба з лука, кіданне сякер і коп'яў), старажытная кухня. А вечаровае прадстаўленне завяршылася фаер-шоу з удзелам вогненных перфомансаў з Беларусі і Літвы.

Заключным жа акордам першага дня Дажынак-2010 стаў святочны феерверк пасля гала-канцэрта «Майстры мастацтва — працаўнікам вёскі».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Лепшыя аграрыі Брэстчыны прымаюць удзел у рэспубліканскім фестывалі-кірмашы працаўнікоў сяла «Дажынкі-2010». Механізатары Аляксандр БАРАН, Уладзімір КАЗІМІРЧЫК, Аляксандр ЛУЦКО.

Фота БЕЛТА.

Галоўны аграном Сяргей ЮРЧАНКА:

«НА ДЗЕНЬ СПАЗНІЎСЯ — НА ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ НЕ РАЗЛІЧВАЙ!»

Трэці год запар лідарам па ўраджайнасці збожжавых на Гомельшчыне выходзіць КСУП «Агракамбінат «Холмеч» Рэчыцкага раёна (дырэктар Віталь Панчанка). Сярэдняя ўраджайнасць збожжа сёлета ў гаспадарцы склала 71,7 цэнтнера з гектара. Вялікі ўклад у такія поспехі, безумоўна, і галоўнага агранома сельгаспрадпрыемства Сяргея Юрчанкі, з якім мы гутарым якраз напярэдадні свята хлебаробаў у Лідзе.

— Выдатны настрой перад Дажынкамі! Хоць у нас і не атрымалася дабіцца леташніх поспехаў з-за спякоты, аднак і сёлетнія недрэнныя.

Фота БЕЛТА.

Сяргей Іванавіч з свой час пайшоў па бацькавай дарозе. Той усё жыццё прысвяціў зямельцы, працаваў брыгадзірам у Лоеўскім раёне. Пасля заканчэння акадэміі ў Горках, у 90-я гады, Сяргей Юрчанка вярнуўся дадому, каб працягваць справу продкаў. Гэта ўжо потым пераехаў у Рэчыцкі раён, але таму, чаму вучыўся, — не здрадзіў, хоць спакусы і былі. І вось пяць гадоў як ён — галоўны аграном у гаспадарцы, якую на Гомельшчыне па праву лічаць флагманам сельгасвытворчасці, у агракамбінаце «Холмеч» Рэчыцкага раёна.

Гаспадарка, дзе зараз працуе Сяргей Іванавіч, з часу заснавання ў 1931 годзе спазнала шмат пераўтварэнняў, некаторая частка з іх выпала і на долю сённяшняга галоўнага агранома. Амаль увесь час калгас узмацняўся, прырастаў новымі населенымі пунктамі і палеткамі. Пасля чарнобыльскіх падзей сюды пераехалі жыхары 7 раёнаў Гомельшчыны: Брагінскага, Хойніцкага, Чачэрскага, Лельчыцкага, Нараўлянскага, Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага. Паступова і цэнтральная сядзіба — вёска Холмеч — стала змяняцца: тут пабудаваныя шматпавярховыя дамы, катэджы, новы дзіцячы садок, крамы, школа. Між тым, цяпер у склад аб'яднанай гаспадаркі ўваходзіць 15 населеных пунктаў з агульнай колькасцю больш за 3 тысячы чалавек. Працаздольных трэба заняць работай, якая б прыносіла і задавальненне, і прыбытак. Практычна шостая частка жыхароў аграгарадка працуе на месцы. Асноўны вытворчы кірунак гаспадаркі, якая носіць сёння афіцыйна назву КСУП «Агракамбінат Холмеч», — малако і мяса, з развітай галіной раслінаводства. На больш чым 11 тысячах гектараў вырошчваюць збожжа, бульбу, гародніну, садавіну. Бальнасць зямлі ў гаспадарцы крыху вышэйшая, чым у суседзяў, аднак не нашмат: сярэдняя — 36. Расказвае галоўны аграном Сяргей Юрчанка:

— У нас у гаспадарцы вельмі моцная агранамічная служба, добрыя спецыялісты, якія дакладна кантралююць усе тэхналагічныя працэсы на палетках: дакладныя тэрміны сяўбы, апрацоўкі, унясення ўгнаенняў. Мы заўсёды прыслухоўваемся і выкарыстоўваем у сябе рэкамендацыі вучоных — наконт угнаенняў, гербіцыдаў... Вельмі важна ўсе рэкамендацыі своечасова выконваць — ні кроку ў бок. У нашай справе на дзень-другі спазніўся з сяўбой ці апрацоўкай глебы — усё, на добры ўраджай не разлічвай. Сучасная тэхніка, вядома, вельмі дапамагае, але ж людзі — гэта самае галоўнае.

Сёлетняя спякота адмоўна адбілася і на ўраджаі ў агракамбінаце «Холмеч». І тым не менш вынік — больш за 70 цэнтнераў з гектара збожжавых. Пры тым, што на Гомельшчыне некаторыя гаспадаркі пры аднолькавай бальнасці зямлі і да 40 цэнтнераў з гектара не дацягнулі.

— У нас 70 — не мяжа, — лічыць Сяргей Іванавіч.- Летась жа сярэдняя ўраджайнасць па гаспадарцы была 84,8 цэнтнера з гектара. Лепш за ўсё ў нас уразілі азімыя: пшаніца, трыцікале, ячмень. З яравымі трохі горш. Сёлета менавіта з-за спякоты і недахопу вільгаці мы не выйшлі на свае паказчыкі. Яшчэ поспех, думаю, залежыць ад новай магутнай сельскагаспадарчай тэхнікі. Мы закупілі новыя пасяўныя агрэгаты, апырсквальнікі, новую корма- і збожжаўборачную тэхніку. Важна і тое, што ёсць каму яе плённа выкарыстоўваць. У нашай гаспадарцы працуюць вельмі вопытныя механізатары. З году ў год яны выходзяць у лідары або па вобласці, або па рэспубліцы: Валянцін Саламаха, Аляксандр Грань, Васіль Лазбень і Васіль Коваль. Калісьці да нас далучылі гаспадаркі — іх кантралююць высокакласныя спецыялісты: Анатоль Гародны кіруе аддзяленнем у вёсцы Артукі, Ігар Буднік — у вёсцы Пракісель... Перспектыўныя, адказныя спецыялісты. Улічыце і тое, што і наш кіраўнік — дырэктар КСУП Віталь Панчанка — па адукацыі аграном. Вось так, сумесна, і атрымліваюцца стабільна высокія вынікі ў сельгасвытворчасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Дырэктар ААТ «Александрыйскае» Віктар ДЗЮРДЗЬ:

«САКРЭТ ПОСПЕХУ — У СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ І ДОБРЫХ ПРАЦАЎНІКАХ»

Дэлегацыя ААТ «Александрыйскае» Шклоўскага раёна бярэ ўдзел у Рэспубліканскім фестывалі працаўнікоў сяла «Дажынкі-2010». Гэтая гаспадарка прызнана адным з лепшых сельгаспрадпрыемстваў Беларусі.

У складзе дэлегацыі на «Дажынках» — 7 чалавек: камбайнеры, вадзіцелі, намеснік кіраўніка па раслінаводстве. А ўзначальвае яе дырэктар ААТ «Александрыйскае» Віктар ДЗЮРДЗЬ.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

— Мы едзем на «Дажынкі» ў трэці раз. Калісьці ў нас было другое месца ў спаборніцтве сярод сельгаспрадпрыемстваў, а цяпер — першае. Мы намалацілі 32,2 тысячы тон збожжа ў бункернай вазе. Ураджайнасць — 72,7 цэнтнера з гектара.

— Спякота і засуха ўнеслі свае карэктывы ў гэтыя лічбы? Яны маглі быць большыя?

— Так, спадзяваліся на ўраджайнасць болей за 80 цэнтнераў з гектара, але надвор'е перашкодзіла. У нас нічога не згарэла, аднак зерне было шчуплае. Таму ўраджайнасць атрымалася меншая, чым хацелася. Але і гэта няблага для гэтага года.

— Віктар Уладзіміравіч, як даўно вы ўзначальваеце «Александрыйскае»?

— Больш за 4 гады. Я родам з Гродзенскага раёна. Працаваў 15 гадоў начальнікам комплексу ў знакамітым «Кастрычніку» Гродзенскага раёна, потым кіраваў комплексам па вытворчасці свініны «Усходні» Баранавіцкага раёна. Я прыняў прапанову ўзначаліць «Александрыйскае» і не шкадую пра гэта.

— Якія асноўныя праблемы даводзіцца пераадольваць на цяперашнім дырэктарскім месцы?

— Яны звязаныя са станаўленнем працоўнага калектыву. Спецыялісты падбіраюцца, і ў асноўным гэта маладыя людзі, пасля заканчэння навучальных устаноў. Таксама шукаем механізатарскія кадры, іншых спецыяльнасцяў. Так што наш калектыў сапраўды яшчэ на шляху станаўлення.

— А колькі людзей сёння працуе ў «Александрыйскім»?

— Увогуле 589. І гэта няшмат, таму што цяпер у нашай гаспадарцы 14,5 тысячы гектараў сельгасугоддзяў, 6 малочнатаварных комплексаў, свінагадоўчы комплекс, падсобная гаспадарка, сад, камбікормавы завод.

— Значна! Вы збіраецеся пашырацца?

— Па зямлі — не. Аднак у планах запуск птушкакомплексу на 1 мільён адначасовай пасадкі бройлераў. Плюс другая чарга свінакомплексу на 25 тысяч галоў адкорму ў год. Мы таксама хочам пабудаваць цэх па разліве мінеральнай вады, 3 гідраэлектрастанцыі, 2 біягазавыя ўстаноўкі, ды яшчэ развіць сваю рыбную гаспадарку з цэхам перапрацоўкі рыбы.

— Калі ж ажыццявяцца такія вялікія планы?

— Гэтыя праекты паспрабуем завяршыць да канца будучага года, максімум — да сярэдзіны 2012 года.

— У чым сакрэт поспеху вашай гаспадаркі?

— У выкананні тэхналогіі. І яшчэ кадры — яны вырашаюць многае. Па-першае, кадры павінны праходзіць добрую падрыхтоўку ў навучальных установах, дзе іх вучаць сучасным тэхналогіям. А па-другое, у моладзі павінна быць жаданне працаваць на зямлі.

— Якія задачы як дырэктар вы цяпер ставіце перад сваімі работнікамі?

— Удасканальвацца, атрымліваць больш высокія ўраджаі, прыросты і надоі. Гэта цалкам магчыма пры выкананні тэхналогіі, правільным кармленні, удасканаленні племянной працы.

— Цяпер, калі сельскагаспадарчы сезон падышоў да завяршэння і традыцыйных «Дажынак», ці азначае гэта палёгку для працаўнікоў сяла?

— Зусім не. Трэба рыхтавацца да наступнага сезону, рамантаваць тэхніку. Фермы працуюць, і іх трэба абслугоўваць. Вываз гною, завоз саломы, шмат чаго. Так што працы ў сялян заўсёды хапае.

— З якім настроем едзеце ў Ліду?

— Быць удзельнікамі «Дажынак» — гэта вялікі гонар. Вельмі прыемна, што і мы з «Александрыйскага» туды трапілі. Увага да нас стымулюе, прымушае лепей працаваць. А я асабіста не быў у Лідзе некалькі гадоў, і мне будзе цікава паглядзець, як змяніўся гэты горад.

— Якія вашы пажаданні калегам да свята?

— Лепей працаваць! Павышаць сваё майстэрства. І калі добра папрацуеш — добра і адпачыць.

— Але перш і добра зарабіць!

— Дарэчы, за 8 месяцаў сярэдні заробак у ААТ «Александрыйскае» склаў 1 мільён 204 тысячы рублёў, што складае 400 долараў. Да канца года мы плануем падысці да 500-доларавага рубяжу. Будзем імкнуцца да гэтага і працаваць!

Гутарыла Ілона ІВАНОВА. *Шклоўскі раён.*

Другое жніво СЯРГЕЯ КУЗНЯЦОВА

Жыве ў Дзямянчыцах Камянецкага раёна звычайны хлопец **Сяргей КУЗНЯЦОЎ**. У маці яго Веры Ягораўны трое сыноў і дзве дачкі. Змалку прывучаныя да працы, дзеці заўсёды былі ёй апорай. Дзяўчаткі меншыя, а ўсе хлопцы ўжо — на сваім хлебе, і ні за аднаго ёй не даводзілася чырванець. Сама Вера Аляксюк многія гады шчыруе на ферме. Ну і сыны, калі малыя былі, ёй дапамагалі. Потым павырасталі, атрымалі кожны сваю спецыяльнасць, пайшлі на работу. Сярэдні Сяргей пасля школы скончыў вучылішча механізацыі і прыйшоў у родную гаспадарку трактарыстам. Цяпер у свае 26 год ён ужо механізатар з 7-гадовым стажам. Першыя пяць гадоў малады механізатар працаваў на ферме вёскі Лешніца. Там ён спраўляўся з усёй работай па дастаўцы кармоў, ачыстцы памяшкання і іншымі справамі, якія патрабуюць механізацыі. Дарэчы, зараз на гэтай ферме працуюць два трактарысты.

Але старанне і добрасумленнасць маладога працаўніка былі заўважаны, і яго перавялі на самы адказны ўчастак сельгаспрадпрыемства — палявыя работы. У ААТ «АграТурна» ўсяго шэсць камбайнаў — сучасных магутных сельгасмашын. Зразумела, што іх давяраюць найлепшым. Так, летась упершыню Сяргей Кузняцоў сеў за штурвал камбайна КЗС-10. Працаваў, як заўсёды, самаддана. І адразу ж выйшаў у лік перадавікоў раённага спаборніцтва сярод моладзевых экіпажаў. Заняў другое месца. Пра сёлетняе жніво сціплы перадавік гаворыць, як пра звычайную работу: «Працавалі звычайна з 6.30 да 11, 12 ночы. Цяжкавата было ў спёку. Пад самы канец уборкі нават кандыцыянер пачаў барахліць».

Разам з памочнікам Мікалаем Ахрэмуком яны намалацілі 1314 тон збожжа і выйшлі на перадавыя пазіцыі ў краіне сярод моладзевых экіпажаў камбайнераў. Пра сваю перамогу ў спаборніцтве Сяргей даведаўся не так даўно, адразу і не зусім паверыў. Але як паклікалі ў Брэст на прымерку святочнага касцюма, то зразумеў, што на лідскія «Дажынкі» ён усё ж паедзе. Вядомая справа, крышку хвалюецца, там жа на сцэну трэба выходзіць — практычна перад усёй краінай! Дома за яго ўсе таксама перажываюць. Знаёмыя ўжо цікавяцца, якія падарункі прывязе з фестывалю. А вось дырэктар ААТ «АграТурна» Сяргей Шальпук ці то жартам, ці сур'ёзна пажадаў трактарысту, каб той з дажынак прывёз сабе... нявесту.

«Ён такі спакойны, памяркоўны хлопец з добрай душой, — гаворыць Сяргей Яўгенавіч, — хочацца, каб і дзяўчына трапілася харошая. Дом адразу ж дадзім. Астатняе самі здабудуць — рукі ў яго залатыя».

Аказалася, што з дзяўчатамі ў Турне ды навакольных вёсках — напруга. З Сяргеевых аднакласнікаў засталося ў родных мясцінах пяцёра. І ўсе хлопцы. Дзяўчаты ж з усіх сілаў стараюцца выбрацца ў горад. І хоць там многім даводзіцца здымаць за вялікія грошы кватэру альбо ўпрагацца ў крэдыты, ледзь не зубы паклаўшы на паліцу, у вёску назад не спяшаюцца. З кадрамі сельгаспрадпрыемства час ад часу адчувае праблемы. А працаваць сёння можна і ў вёсцы.

Сёлета, паводле слоў кіраўніка гаспадаркі, трошкі недабралі па ўраджайнасці ў параўнанні з мінулагоднім, атрымалі 32,9 цэнтнера збажыны з гектара, а летась было больш за 35. Трыцікале дрэнна перазімавала, давялося дзе-нідзе перасяваць, і лубін не ўрадзіў. А вось пшаніца і ячмень выраслі лепшыя, чым летась. «Нагрузка на камбайн у гаспадарцы вялікая, — расказвае Сяргей Шальпук, — і механізатары працавалі з поўнай аддачай, ніхто не падвёў. Усяго ў нас было два моладзевыя экіпажы. Неяк прыязджаю на поле а палове першай ночы, яны яшчэ жнуць, і адразу да мяне: «Не праганяйце нас з поля, мы хочам гэты ўчастак скончыць!» Кажу, што я не праганяць прыехаў, а паглядзець, як праца ідзе. Хоць пасля гадзіны ночы ўбіраць, як правіла, немэтазгодна: выпадае раса, калоссе трохі адсырвае. Ды і адпачываць людзям трэба, чалавек жа — не машына. А сам унутры тады парадаваўся: гэта ж добра, калі маладыя з такім імпэтам да працы ставяцца. На жаль, не з усімі гэта здараецца».

А ў дзень, калі аўтар гэтых радкоў прыехала ў «АграТурну», ішоў дробны дождж, і Сяргей Кузняцоў разам з напарнікам сеялі жыта. Сяўба падыходзіць да канца, а значыць, будзе новы ўраджай і новае жніво.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *Камянецкі раён.*

06.10.2010 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Универсам «Северный»

Повестка дня:

1. «О сделках Общества».

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3. Начало регистрации участников собрания 28.09.2010 г. с 11.00 до 13.00.

УНП 100356386

ВНИМАНИЕ УЧАСТНИКОВ АУКЦИОНА!

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ сообщает об отмене следующих аукционов:

на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле, назначенного на 30 сентября 2010 г.; повторного на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле, назначенного на 30 сентября 2010 г.; по продаже земельных участков в г. Гомеле под индивидуальное жилищное строительство, назначенного на 18 октября 2010 г.

Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт: www. gorod.gomel.by

СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ...

Аграрнікі Прынямоння ўспрымальныя да навацый, але без залішняй рызыкі

ЗЕМЛЯРОБЫ Гродзеншчыны сабралі сёлета больш за 1 мільён 300 тысяч тон збожжа пры найлепшай у краіне сярэдняй ураджайнасці — больш за 40 цэнтнераў з гектара. Аднак ніякай эйфарыі з гэтай нагоды ў начальніка ўпраўлення раслінаводства Гродзенскага аблсельгасхарча Франца ЖЫЖНЕЎСКАГА няма, бо летась было 45 цэнтнераў, а сёлета разлічвалі нават на большае. На яго думку, было зроблена ўсё для ўраджайнасці ў 50 цэнтнераў, але гэтаму перашкодзілі анамальныя ўмовы надвор'я.

Сапраўды, ёсць і заўсёды будуць фактары надвор'я, на якія аграрнікі паўплываць не здатныя. Але што ж у іх сілах, каб як мага менш залежаць ад капрызаў надвор'я і дасягаць дастойных вынікаў?

Гарачыя галовы і дакладны разлік

— Перш за ўсё мы штогод стараемся нейкім чынам перагледзець структуру пасеваў. Але не ў такіх аб'ёмах, як камусьці хочацца. Ёсць гарачыя галовы, якія згодныя памяняць структуру ледзь не на 50 працэнтаў, аднак гэта вельмі рызыкоўна. Збожжавы клін — гэта, скажам так, вельмі вялікі карабель, які нельга адразу ж павярнуць на месцы. Для гэтага патрэбен час, нават доўгія гады. Таму мы стараемся стабілізаваць структуру пасеваў, штогод уносячы пэўныя карэктывы. Напрыклад, павялічваем плошчы азімай пшаніцы — трохі скарачаем трыцікале, бо ў два апошнія гады была перавытворчасць гэтай культуры. Больш запатрабаваны сёння, асабліва ў жывёлагадоўлі, ячмень — пашыраем гэтыя плошчы. А ў цэлым структура збожжавага кліна застаецца стабільнай.

Галоўнае, вядома, гэта тэхналогіі, севазварот і тэхнічнае забеспячэнне.

«Доктар» у полі

— Сёння многія яшчэ недастаткова разумеюць, што адзін з асноўных «бічоў» у вытворчасці збожжавых культур — гэта хваробы раслін. Сёлетні год у гэтым пытанні для нашай вобласці быў надзвычай складаным, нетыповым. Спёка і... частыя дажджы, што спрыяла магутнаму развіццю пустазелля і хваробаў. Разумеючы гэта, мы стараліся самыя высокаўраджайныя пасевы двойчы апрацаваць супраць хваробаў. Мяркуючы па ўраджайнасці, гэта ў нейкай ступені дало плён. Але і засталіся ўрокі на будучыню, паколькі нават добрыя гербіцыды не заўсёды давалі чаканы вынік.

«На Гродзеншчыне распрацоўваецца абласная праграма развіцця бульбаводства на 2011-2015 гады. Плошчы пад бульбу плануецца павялічыць удвая, а валавы збор — у тры разы за кошт аснашчэння новай тэхнікай і прымянення найбольш інтэнсіўных, перадавых гатункаў. Да 2015 года мяркуецца дасягнуць сярэдняй ураджайнасці на ўзроўні 320 цэнтнераў з гектара».

Другі фактар, які мы лічым найважнейшым — гэта прымяненне мінеральных угнаенняў. Стараемся іх выкарыстоўваць збалансавана, бо кожны элемент пажыўных рэчываў мае сваю асаблівасць, сваю цану і свой дэфіцыт у глебе. Нас перш за ўсё турбаваў дэфіцыт фосфарных угнаенняў. Пры цяперашніх фінансавых магчымасцях гаспадарак было вельмі складана іх набыць, але мы гэта зрабілі. Прычым даволі значную колькасць завезлі з-за мяжы, бо наша прамысловасць пакуль стопрацэнтна гэтым відам угнаенняў аграрнікаў не забяспечвае.

Вельмі важным элементам у нашых тэхналогіях з'яўляюцца і арганічныя ўгнаенні, якімі, з улікам раслінных астаткаў і здробненай саломы, практычна забяспечваецца бездэфіцытны баланс гумусу ў глебе.

Як не загубіць выдатны гатунак?

— Можна мець цудоўныя гатункі сельгаскультур, але не выканаць тэхналагічныя патрабаванні (пачынаючы ад падрыхтоўкі насення і заканчваючы доглядам пасеваў) і загубіць іх. Таму наша тактыка наступная. Гаспадаркі з высокімі ўраджаямі перш за ўсё прымяняюць заходнія і айчынныя высокаінтэнсіўныя гатункі, якія асабліва ўспрымальныя да ўсіх элементаў тэхналогіі догляду. А дзе ўрадлівасць глебы нізкая і ўгнаенняў уносіцца недастаткова (не дазваляюць фінансавыя магчымасці) — там прымяняюцца ў асноўным традыцыйныя гатункі. І яны таксама даюць сваю аддачу. Гэта лепш, чым выкарыстоўваць «казырныя» гатункі на нізкаўрадлівых землях, з недахопам угнаенняў і сродкаў аховы раслін. Вынік будзе дрэнны, паколькі большае, так бы мовіць, большага і патрабуе.

«Сёлета ў вобласці павялічваюць аб'ёмы закладкі ў стабілізацыйны фонд на міжсезонны перыяд плодаагароднінай прадукцыі. У сховішчах для патрэбаў насельніцтва яе будзе больш за 6 тысяч тон, у тым ліку 2840 тон капусты, 1320 — цыбулі, 970 — морквы, 680 — буракоў і 840 тон яблыкаў.

Згодна з інфармацыяй генеральнага дырэктара абласной асацыяцыі вытворцаў плодаагароднінай прадукцыі Віктара Кірэя, у адной з гаспадарак Бераставіцкага раёна паспрабуюць на пятнацаці гектарах вырошчваць вінаград».

Варта спыніцца ў прафесійным росце — і ты ўжо адстаеш

— Можа, я яшчэ не павінен апавядаць пра бліжэйшыя планы і праекты, бо наперадзе зіма, калі мы лічым-пералічваем, карэктуем. Аднак абсалютна ўпэўнены, што будзем больш сур'ёзна займацца вытворчасцю зерня кукурузы, пашыраць пасевы. Сёлета атрымліваем больш за 90 цэнтнераў з гектара, гэта культура вельмі запатрабаваная. Большую ўвагу нададзім крупяным культурам, перш за ўсё грэчцы, пашырым плошчы пад бульбу з упорам на больш інтэнсіўныя тэхналогіі, а таксама паклапоцімся аб далейшым павышэнні ўраджайнасці цукровых буракоў. Вельмі сур'ёзна будзем займацца кормавытворчасцю, паколькі жывёлагадоўля з'яўляецца асновай для фінансавых магчымасцяў нашых гаспадарак. І яшчэ. Цяпер вядзецца тэхнічнае і тэхналагічнае пераўзбраенне сельгаспрадпрыемстваў па вытворчасці лёну. Пакуль у тэхналагічным плане мы сур'ёзна адстаём ад Еўропы. Аднак пераканы, што ў бліжэйшыя гады гэтая культура таксама зойме заслужанае месца ў сельскай гаспадарцы Гродзеншчыны.

Зіма, дарэчы, у нас традыйна і самы плённы час для вучобы кадраў аграномічнай службы. Штогод праводзім кароткатэрміновую вучобу галоўных аграномаў у Гродзенскім аграрным універсітэце з запрашэннем вучоных, айчынных і замежных спецыялістаў высокага класа. Стараемся паказаць усё найноўшае, бо варта спыніцца ў прафесійным росце — і ты ўжо адстаеш.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Беларускія пагранічнікі перашкодзілі бацьку незаконна вывезці дачку ў Аўстрыю

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-цэнтры Дзяржпагранкамітэта.

Трыццацігадовы пасажыр, які вылятаў з 9-гадовай дачкой у Аўстрыю, на лініі пашпартнага кантролю ў Нацыянальным аэрапорце Мінск прад'явіў фальшывы дакумент. Мужчыну і дзіця затрымалі для разбору. Хутка высветлілася, што затрыманы мае два грамадзянствы — Турцыі і Вялікабрытаніі. Дзяўчынка — яго родная дачка. Мужчына запэўніваў, што ён не ведае, дзе яго жонка, маці дзіцяці, паколькі яны даўно не сустракаліся і не жывуць разам.

Турэцкае пасольства ў Беларусі аператыўна прадаставіла затрыманым пасведчанні на вяртанне. Аднак высветлілася, што дзяўчынка таксама мае двайное грамадзянства — турэцкае і расійскае. Яна была ў вышуку праваахоўнымі органамі Расіі. Прадстаўнік Пасольства Расіі ў Беларусі прадаставіў копію заявы маці дзяўчынкі, жыхаркі Сергіева Пасада, аб знікненні дзіцяці, а таксама копію рашэння суда, згодна з якім бацька не меў права вывозіць дзіця з тэрыторыі Расіі без згоды маці.

Злоўлены на незаконным вывазе дзіцяці з тэрыторыі Расіі затрыманы заявіў, што два гады таму маці насільна вывезла дзіця з Англіі, дзе ён жыў з дачкой, і заявіў хадайніцтва аб сустрэчы з паслом Вялікабрытаніі. Гэта просьба была задаволена, аднак ніякія дакументальныя пацвярджэнні сказанаму прадастаўлены так і не былі. У разборы гэтага інцыдэнту ўдзельнічалі прадстаўнікі трох дыпламатычных місій — Турцыі, Расіі і Вялікабрытаніі.

За парушэнне правілаў перасячэння дзяржаўнай граніцы Беларусі затрыманы быў прызнаны парушальнікам рэжыму граніцы. У адпаведнасці з дзейным заканадаўствам на яго накладзены штраф у памеры 20 базавых велічынь. У добраахвотным парадку ён дэпартаваны з Беларусі і на пяць гадоў пазбаўлены права ўезду ў рэспубліку. Дзяўчынка перададзена расійскаму боку для вяртання маці.

Тэлесеткі

БУЛКА, КАМКА І КАЛДУН

Тэлеканал АНТ запрашае на «Кухню»

Фота прэс-службы АНТ.

На кухні няма забароненых тэм: тут можна гаварыць пра ўсё і ўсіх. Узброіўшыся народным дэвізам, АНТ стварыла ўласную «Кухню» — гумарыстычнае скетч-шоу.

Весці новы праект стануць Георгій Калдун, Яўген Булка і Мікалай Камка. І як абяцаюць сцэнарысты, вядучыя ў кожным выпуску «Кухні» разам з гасцямі будуць абмяркоўваць пытанні і падзеі, актуальныя для Беларусі.

Тэма першага эфіру — прэзідэнцкія выбары. І запрошаны на яго... Яўген Крыжаноўскі, мастацкі кіраўнік тэатра «Хрыстафор». Дзевяць гадоў таму Крыжаноўскі сам збіраўся стаць кандыдатам у прэзідэнты, і нават сабраў дзеля гэтай мэты 42 тысячы подпісаў...

Пра тое, што было б, каб Крыжаноўскі ўсё-ткі стаў прэзідэнтам, герой сам падзеліцца з гледачамі, уявіўшы, як змянілася б жыццё беларусаў.

Шоу стартуе ў вячэрнім эфіры тэлеканала 26 верасня.

Ілья ЛАПАТО.

НЯСВІЖЧЫНА: РЭАЛІІ І ДАЛЯГЛЯДЫ

Сельскія працаўнікі Нясвіжскага раёна атрымалі сёлета адзін з найбольш высокіх ураджаяў збожжавых і зернебабовых і выйшлі на адпаведных паказчыках на другое месца ў краіне пасля Гродзенскага раёна

ААТ «Новае жыццё»

На Нясвіжчыне летам таксама прыпякала...

Андрэй Ратомскі, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Новае жыццё», якое мы наведалі напярэдадні рэспубліканскіх Дажынак, паказваючы нам сваю гаспадарку, а ў прыватнасці, знаёмячы з тым, як у ёй ідзе ўборка цукровых буракоў, з настальгіяй заўважыў:

— А вось непадалёк адсюль, за тым хутаром, месцыца гаспадарка «17 верасня», мяжуем з ёй...

Настрой Андрэя Ратомскага стаў адразу зразумелым пасля таго, калі ён паведаміў: стаў ён на чале «Новага жыцця» з пачатку сёлетняга года, а да гэтага 6 гадоў запар узначальваў менавіта гаспадарку «17 верасня», якая была падчас яго кіраўніцтва, застаецца і цяпер адной з лепшых у раёне, ды і ў вобласці. «Летась у гэтай гаспадарцы была самая высокая ўраджайнасць збожжавых, суперніча са «Снова», і сёлета яна другая пасля «Снова»; і з фінансамі ў ім лепей...».

— Што яшчэ цяпер робім? — перапытаўся Міхаіл Аляксандравіч. — Усё, работы хоць адбаўляй. Аром, сеем, выводзім на палі ўгнаенні... Добры ўраджай, па сутнасці, закладваецца яшчэ ўвосень. Ці не так?

Нам застаецца толькі пагадзіцца з Міхаілам Аляксандравічам, ці, дакладней, пагадзіцца з яго багатым вопытам: а працуе ён галоўным аграномам ужо 40 гадоў.

У «Новым жыцці» таксама актыўна вялі сяўбу, або, як сказаў крыху вышэй галоўны аграном, закладалі той жа будучы ўраджай. Асноўная ўвага ў гаспадарцы — азімым пасевам, якія, паводле слоў яе спецыялістаў, маюць больш высокі патэнцыял. Адпаведна, азімыя па плошчы будуць перавышаць яравы клін амаль у 1,5 раза.

* * *

Гэты год стаў адметным для гаспадаркі яшчэ і ў тым плане, што ў ёй, побач з зернесушыльнай, з'явіўся абсалютна новы і перспяктыўны комплекс па захаванні збожжа: тры серабрыстыя цыліндрычныя ёмістасці на 2000 тон кожная. Прычым гэты комплекс злучаны са зернесушыльнай спецыяльнай галерэяй. «Вельмі зручна, — падкрэслівалі ў гаспадарцы. — Высушыў збожжа і адразу ж адпраўляй яго па галерэі ў сховішча. Ні перагрузак табе ніякіх, ні перавозак, ды яшчэ з адпаведнымі стратамі...» Гэтыя цыліндрычныя «амбары» выраблены на «Лідсельмашы». Унізе кожнай ёмістасці стаіць па два электрарухавікі, якія актыўна вентылююць збожжа.

Такія ёмістасці пачалі з'яўляцца ў гаспадарках краіны, прычым менавіта ў звязцы з зернесушылкамі, пасля адпаведнага даручэння прэзідэнта краіны.

— Тым не меней, і мы па ўраджайнасці амаль побач — па 64,5 цэнтнера з гектара збожжавых і зернебабовых атрымалі, — працягваў Андрэй Ратомскі. — Больш, чым летась. Агульны збор збожжа — 11228 тон, на 1213 тон больш сабралі да ўборачнай мінулага года. Здалі 1900 тон харчовай пшаніцы, 1800 — піваварнага ячменю. Прычым піваварнага ячменю здалі больш за ўсіх у раёне. І па ААТ «Крыніца», згодна з іх звесткамі, — гэта найлепшы вынік. Пры гэтым якасць — выдатная. А ўвогуле, якасць усіх збожжавых нядрэнная...

— Атрымліваецца, і надвор'е, на якое сёлета вельмі многія скардзіліся, не паўплывала? — пытаюся ў Андрэя Ратомскага.

— Менавіта ў час усё нармальна, хіба льнотрасты трохі перасушыла, а льном у гаспадарцы было засеяна 100 гектараў. Затое атрымалі неблагое лыонаценне — больш за 10 цэнтнераў з гектара. Гэта здзін з лепшых вынікаў у вобласці. А што датычыць надвор'я, дык яно, як і паўсюдна, было цікавым і ў нас. Таксама моцна прыпякала, і нават да 38 градусаў даходдзіла, і гэтая гарачыня вельмі доўга трымалася...

Але і з гарачынёй, паводле шэфдарга перакананняў кіраўніка гаспадаркі, можна і трэба змагацца, толькі дзёра «варушыцца» пры гэтым належала.

Адным як можна змагацца, ці, дакладней, як змагаліся са спякотай у «Новым жыцці»?

Аказваецца, расліны можна абараняць ад гарачыні спецыяльнымі прапаратамі (што і рабілі у гаспадарцы) — прапаратамі, якія стрымліваюць выхадзяжэнасць раслін, змякчаюць уплыў на іх той ка гарачыні. А калі пасля гэтай гарачыні — дожджык, тэмпературка паветра панізіцца і стала больш-менш аптымальнай, ўмовы надвор'я, не чакаючы адпаведных наступстваў.

Словам, тая ўраджайнасць, якую атрымалі ў гаспадарцы, — невыпадкова. Вядома, дарэчы, што ў «Новым жыцці» і менавіта на большае ў ёй з самага пачатку і разлічвалі. «Аднаазначна, недабор ураджаю быў», — заўважыў кіраўнік. Карацей кажучы, цалкам выключыць прыродны фактар, як гэта ні сумна, сельскаму працаўніку пакуль што ніяк нельга.

* * *

Адным тое ці летняй гарачыні ўжо няма, а клопату ў вяскоўцаў не паменшала. Хутчэй, наадварот, клопату ўвосень нават стала болей. Летам сельскія працаўнікі дапаможнага комплексу, увосень далятаюць думкі: як хутчэй і без страты усё ўбраць? Выразіць дробы ўраджаі ён ён у «Новым жыцці» (толькі пра збожжавых) — гэта, па сутнасці, вялізны трыадзінаццаць раслін залежыць і ад таго, як глеба да пасевай падрыхтавана, і ад якасці насення, і ад іх належнага пратручвання, ад своечасовага ўнясення гербіцыдаў і г.д. «Тут цэлая навука патрэбна», — падкрэслівае Андрэй Ратомскі.

Менавіта так усё і было; гэта значыць менавіта, з навукай, і у прыватнасці, з Інстытутам абароны раслін, гаспадарка і супрацоўнічала. І, як падкрэслівалі ў ёй, супрацоўніцтва практычна ва ўсіх гаспадарках. Сплюшчанае зерне захоўваецца ў вадкумных даўжэзных сінтэтычных пакетах — не трэба спецыяльных тэмпературных рэжымаў, спецыяльных сховішчаў і г.д. Проста, зручна і эканомна. А гаплоўнае — выдатны высокаэнергетычны корм атрымліваецца для жывёлы, які яна добра засвойвае. Адсюль, зразумела, і добрае малако. Дарэчы, на Нясвіжчыне гучную славу малочнай гаспадаркі раёна набылі ў агульнае карыстанне, скажыліся на ім.

Адпаведна, аўтаматызаваны жывёлагадоўчы комплекс, у якім прадугледжаны прапрацоўчыя і намнога больш камфортныя ўмовы ўтрымання жывёлы, са спецыяльным дзільным блокам, з камп'ютарызацыяй усяго працэсу ўтрымання, вентыляцыяй і дзення яе. Калі цэлер у «Новым жыцці» адна даярка абслугоўвае 50 кароў, то на ўвесь новы комплекс із спатрэбіцца толькі некалькі.

Ад добрага кармавога стала значна залежаць і прадукцыйнасць жывёлы. Ды і ў «Новым жыцці» ўсё робіцца, каб кармавая база была надзейнай. Ды і ў «Новым жыцці» ўсё робіцца, каб кармавая база была надзейнай. Ды і ў «Новым жыцці» ўсё робіцца, каб кармавая база была надзейнай. Ды і ў «Новым жыцці» ўсё робіцца, каб кармавая база была надзейнай.

«На Дажынкі еду з лёгкім сэрцам»

Калі сёлета ААТ «Птушкафабрыка Дружба» сабрала на сваіх гектарах па 61 ц збожжа, то гэта нікога не здзівіла. Да самага высокага ўраджаю не толькі ў Баранавіцкім раёне, але і вобласці прадпрыемства ішло няўхільна.

Уладзімір МАЗОЎСКІ.

Галоўны аграном сярод спецыялістаў з'яўляецца не апошнім чалавекам, і якім будзе ўраджай — ад яго ў многім залежыць.

Уладзімір Мазоўскі заняў пасаду галоўнага агранома 10 гадоў таму, калі да птушкафабрыкі «Дружба» далучылі заняпалыя калгасы. Вось тады ў прадпрыемства ўзнікла патрэба ў аграноме.

— Уладзімір Канстанцінавіч, што сабой уяўлялі гаспадаркі, якія пад сваё крыло ўзяла «Дружба»?

— Напачатку да нас далучылі два калгасы, яны былі адсталыя. Пра гэта сведчылі і ўраджаі. Хваліцца не было чым — 17 ц з гектара — гэта не паказчык. Праз год на гэтай жа зямлі мы сабралі збожжа па 34 ц/га, і ніжэй ужо не апускаліся. А сёлета ўзялі 61 ц збожжа — рэкорд.

— Усе гэтыя дасягненні не робяцца па ўзмаху чароўнай палачкі. Што паслужыла штуршком?

— У сельскую гаспадарку прадпрыемства пачало ўкладваць грошы. Вялося нарошчванне бройлернай вытворчасці і паралельна падымалася сельская гаспадарка. А інакш адкуль тыя грошы было ўзяць?

— Дарэчы, а што сёння ўяўляе сельская гаспадарка прадпрыемства?

— Да «Дружбы» далучана пяць калгасаў, а неўзабаве давядзецца «прытуліць» і шосты. У нас 10 тысяч гектараў, палі расцягнуліся на 50-60 км. За адзін дзень усё не ахопіш. Тэхніка ў асноўным айчыннай вытворчасці, хоць ёсць і замежная.

— Цікавы адзін момант. Курыны памёт вельмі ўедлівае ўгнаенне, а вы яго выкарыстоўваеце на сваіх землях. Ёсць нейкі сакрэт нейтралізацыі гэтай арганікі?

— Усё вельмі проста. Памёт мы вывозім на сховішча, там ён ляжыць паўгода, пад уплывам натуральных працэсаў нейтралізуецца, і раслінам ад яго толькі карысць.

— На камбікорм акрамя збожжа яшчэ нешта ідзе?

— Вырошчваем на зерне і кукурузу. За апошнія 5 гадоў атрымліваем па 115-127 ц/га, а гэта вельмі добры ўраджай. Праўда, з кукурузай ёсць і праблемы. Напрыклад, летась была вельмі цяжкая ўборка — ішлі зацяжныя дажджы. Для кукурузы не так маразы страшныя, як макрэча. Хачу дадаць, што ў нас зямля 30,5 балаў, а месцамі і ніжэй. Так што ў яе неабходна многа ўкладваць, каб мець аддачу.

— На ваш погляд, што ў сельскай гаспадарцы самае важнае? Ёсць нейкі ключавы фактар, які вызначае будучы ўраджай?

— Думаю, што дробязяў у тэхналогіі вырошчвання сельгаскультуры не бывае. Тут усё важнае. Адно звяно цягне за сабой другое. Ёсць жа прымаўка «З кепскага семя не будзе добрага племя». Ёсць яшчэ адзін найважнейшы фактар, які ўплывае на ўраджай — гэта прырода.

— Сёлета стаяла спёка. Прасілі ў Бога дажджу?

— Хачу расказаць адну прыпавесць. Стаяла вялікая засуха, і вось людзі вырашылі пайсці да манаха-пустэльніка і прасіць, каб той памаліўся і папрасіў у Бога дажджу. Манах выслухаў іх і сказаў:

— Я магу памаліцца, але дажджу не будзе, бо вы прыйшлі без веры.

— Як гэта так, без веры! — абурыліся людзі.

— Каб вы верылі, што малітва будзе пачутая і пойдзе дождж, то захапілі б з сабой накідкі, плашчы, парасоны...

Думаю, што да ўсяго мы павінны падыходзіць з верай у шырокім сэнсе гэтага слова, і тады будзе вынік. Бязвер'е, апатыя і раўнадушша — тупік.

— Дзеці пайшлі па бацькоўскіх слядах?

— Не, яны дарослыя, жывуць у Мінску і самі выбіралі свой шлях. Бачылі, як цяжка працаваць у сельскай гаспадарцы. Каму з маладых падабаецца не мець выхадных і быць на рабоце ад цямна да цямна?

— Якія склаліся адносіны з кіраўніцтвам птушкафабрыкі, падначаленымі?

— З кіраўніцтвам поўнае паразуменне, бо робім агульную справу. З падначаленымі таксама парадак. Калі нешта не так, то прыводзім у норму. Працаваць у нас нялёгка, і калі нехта не вытрымлівае, то сыходзіць. Дарэчы, сярэдняя зарплата ў тых, хто працуе ў сельскай гаспадарцы, 1 млн 200 тысяч, а гэта моцны стымул для сумленнай працы. А што датычыцца Дажынак, то я еду туды з лёгкім сэрцам.

Генеральны дырэктар ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Васіль МАРКЕВІЧ быў нешматслоўны:

— Мазоўскі — прафесіянал, чалавек на сваім месцы. А ў нас інакш і быць не можа — на прадпрыемстве працуюць спецыялісты, і рэкорды нашы невыпадковыя.

— Далучэнне да «Дружбы» такой колькасці калгасаў...

— Увогуле радасці мала, бо гаспадаркі трэба цягнуць, укладваць грошы, але сёння, калі ў Расіі неўраджай, мы ў выйгрышы — у нас свае кармы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

З РАНІЦЫ І ДА... ПЕРАМОГІ!

МЕНАВІТА так з гумарам «раскрыў сакрэт» сваіх працоўных дасягненняў 28-гадовы Аляксей ПАРЧЭЎСКІ — старшы камбайнер «Агракамбіната «Юбілейны» Аршанскага раёна.

— Я працую ў ААТ «Агракамбінат «Юбілейны». На «Дажынкі» паеду вось ужо ў другі раз, — расказвае Аляксей Мікалаевіч. — Намалацію сёлета больш за дзве тысяч тон збожжавых. Разам паедзем на «Дажынкі» з камбайнерам Ігарам Кліменкам. Працавалі на камбайне «КЗС-1218». Убралі 591 гектар.

— Якая на мінулым жніве была ўраджайнасць збожжавых?

— Розная. Вялікая спякота зрабіла сваю чорную справу. Але і пад 37 цэнтнераў з гектара ўраджайнасць была. Пасля таго як завяршылі абмалот у нашай гаспадарцы, дапамагалі суседзям.

— Верагодна, сёлетняе вельмі спякотнае жніво запомніцца надоўга?

— Так. Але работа ў нас такая: працаваць трэба, калі дазваляе надвор'е. Спякота ў гэтым сэнсе, вядома, параўнальна лепш, чым дажджы.

— Працавалі на жніве з раніцы і да...

— І да перамогі! Так, не вытрымлівалі кандыцыянеры ў кабіне. Так, было трохі непрывычна. Але ж калі жніво бывае лёгкім?

— Акрамя вашага, яшчэ ёсць у гаспадарцы моладзевыя экіпажы?

— Няма, на жаль. Асабіста я вёску пакідаць не збіраюся. Работа мне падабаецца. Усё жыццё звязана з Аршанскай зямлёй. Нарадзіўся ў вёсцы Пуглякі. Там і ў школу хадзіў. Потым вучыўся на механізатара. Пайшоў у армію... Працую ў агракамбінаце з 2001 года. Добры ў нас кіраўнік Аляксандр Уладзіміравіч Фірсін. Людзі працавітыя.

— Напэўна, і вы выраслі ў працавітай сям'і хлебаробаў?

— Так, бацька быў таксама механізатарам. Сям'я ў нас дружная. Акрамя мяне, бацькі выгадавалі яшчэ двух маіх братоў, якія таксама працуюць у сельскай гаспадарцы, і дзвюх сясцёр...

— А ў вас шмат дзяцей?

— Два сыны: старэйшы ходзіць у другі клас, а малога даглядае жонка Наталля Аляксандраўна, якая цяпер у дэкрэтным водпуску. Па адукацыі яна швачка.

— Як вам, прабачце за наступнае жа і наіўнае пытанне з вуснаў гараджаніна, жывецца ў вёсцы?

— Нармальна. Я, прабачце, нават і не ведаю, ці мае наш пасёлак Бабінічы афіцыйны статус аграрнага гарадка, але шчыра скажу, што ўсяго ў нас хапае. Пабудавалі ў апошні час многа, а таксама прывялі ў парадак пасёлак.

— Хвалюецеся перад сустрэчай з кіраўніцтвам дзяржавы? Магчыма, ключы ад аўтамабіля, які вы падчас чарговага жніва заслужылі сваёй стараннай і напружанай працай, уручыць вам асабіста Прэзідэнт краіны.

— Безумоўна, па-свойму хвалююся. Але гэта прыемныя хваляванні... Тым больш што я не адзін паеду на «Дажынкі», а ў складзе дэлегацыі прадстаўнікоў раёна. Ці рыхтуюся неяк да ўдзелу ў «Дажынках»? Вось прыехаў з абласнога цэнтра, нам там касцюмы заказалі. Таксама прыемна.

— Не сакрэт, што пры добрай працы на жніве ў добрага механізатара ёсць магчымасць нядрэнна зарабіць. Мо запланавалі зрабіць нейкую вялікую пакупку? Ці ўжо зрабілі?

— Мо скарыстацца трэба вашай дарадай ды і насамрэч купіць камп'ютар (смяецца)! Безумоўна, трэба не адставаць ад часу, асвойваць «высокія тэхналогіі». Можна было б пры дапамозе інтэрнэту перапісвацца з таварышамі з іншых раёнаў і гэтак далей. Але калі? Работы, хатніх спраў заўсёды шмат...

— А ці ёсць у вас нейкае хобі?

— Рыбалка і паляванне. Асабліва люблю апошняе. Ды, на жаль, часу не хапае і на гэты любімы занятак у вольны час.

— Як вы ставіцеся да ўвагі да сабе прадстаўнікоў прэсы?

— Нават не ведаю, як адказаць на гэтае пытанне. Мяне вашы калегі не раз пыталі пра працу, фатаграфавалі. Не, потым спецыяльна ў кіёсках газеты не шукаю, публікацыі пра сябе не збіраю. А так... Чаму б і не адказаць на пытанні журналістаў? У кожнага свая праца.

— Тады адкажыце на апошняе. Парайце, калі ласка, вашым калегам — механізатарам, якія ніколі не былі ў якасці перадавікоў на «Дажынках», але шчыра, па-добраму і без зайздрасці мараць пра гэта: як і ім «завяваць» туды «пуцёўку»?

— Любіць трэба сваю працу і не скардзіцца на тое, што нешта перашкаджае. Пры жаданні і стараннасці ўсё абавязкова атрымаецца. А прэміі і слава — гэта ўжо другаснае...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Аршанскі раён.

АРШАНШЧЫНА — ЛІДАР ПА КОЛЬКАСЦІ ДЭЛЕГАТАЎ

На рэспубліканскім фестывалі-кірмашы працаўнікоў сяла «Дажынкі-2010» Віцебскую вобласць прадстаўляюць больш за 60 перадавікоў. І што адметна — менавіта Аршанскі раён прадстаўлены найбольшай колькасцю «стахановцаў сяла». У складзе дэлегацыі гэтага рэгіёна на свяце хлебаробаў адразу 11 чалавек.

Па сем прадстаўляюць Докшыцкі і Віцебскі раёны... Перад адпраўкай у Ліду на свята працавітым механізатарам, вадзіцелям і іншым прадстаўнікам аграпрамысловага комплексу падзякавалі за вытворчыя дасягненні і павіншавалі іх кіраўнікі Віцебскага аблвыканкама. Так што прыемных хваляванняў сціплым працаўнікам вёскі, нашым паважаным кармільцам, хапае.

ПАД ЛІДСКАЙ ЗОРКАЙ

Фота БЕЛТА.

Колькі гадоў Лідзе? Ці трэба было аднаўляць разбураную вежу замка? Якім павінен стаць бульвар Гедыміна? Пра ўсё гэта мы гутарым са старшым навуковым супрацоўнікам Лідскага гісторыка-мастацкага музея, кандыдатам геаграфічных навук Валерыем СЛІЎКІНЫМ.

ЛЯ ВЫТОКАЎ ВКЛ

Ужо не першы год уздымаюцца пытанні, якія датычацца даты заснавання Ліды, у асноўным у гэтай «справе» фігуруюць тры лічбы: 1180, 1323 і 1380. Апошняя ўспліла ў 1980-м, у час, калі вялікія юбілеі святкавалі многія гарады былога Саюза, і штосьці падобнае хацелася правесці і ў Лідзе. Юбілей тады з размахам адсвяткавалі, пад яго былі выбітыя грошы, нават з'явілася замкавая плошча. Вось толькі дату 1380 большасць даследчыкаў не падтрымала, яны лічылі, што гісторыя Ліды павінна пачынацца з 1323 года, часу, калі пачаў будавацца замак. Сярод нязгодных быў і Валерый Сліўкін, ён пісаў артыкулы, даваў інтэрв'ю на радыё, дзе гаварыў пра тое, што нельга адбіраць у горада 57 гадоў яго ўзросту. Бо Ліда 1380 года — гэта адзін з мноства гарадоў ВКЛ, а Ліда 1323-га стаіць ля вытокаў Вялікага Княства, заснаваная ў адзін час з Вільняй, радавое гняздо Гедымінавічаў.

— Валерый Васільевіч, а ці можна гісторыю Ліды пачынаць з 1180 года? Некаторыя жыхары горада настойваюць, што сёлета ён павінен святкаваць 830-годдзе.

— Сюды, дзе знаходзіцца цяпер горад, славяне прыйшлі вельмі позна. Славянская экспансія ішла з Прыднястроўя. Славяне ставілі гарады-крэпасці, паставяць рад — прасунуцца наперад, яшчэ рад — зноў прасунуцца. Апошні рад відавочны: Гродна, Ваўкавыск, Навагрудак, гэтыя гарады ўтварыліся ў X - XI стагоддзях. Праз Нёман яны не перайшлі. Калі паглядзець на карту, з поўдня Нёман акружае ўвесь Лідскі і Шчучынскі павет. А з другога боку была непраходная тэрыторыя, вялікія Дакудаўскія балоты, якія цягнуліся на 4-5 кіламетраў, праз іх не было праходу, і гэта стрымлівала прасоўванне славян у гэты бок. Неяк я падняў карту XIX стагоддзя, дзе паказаны ўсе грэблі, дамбы. Быў уражаны: наша тэрыторыя — гэта суцэльныя астравы, аб'яднаныя дамбамі. Калісьці Ліднчына была чымсьці падобная на сучасны Браслаўскі край з азёрамі, астравамі, перашыйкамі, пасля ўсё зарасло, азёры ператварыліся ў балоты, пазней землі абжываліся, з'яўляліся дарогі. Нават людзі ў нашым раёне, на мой погляд, розняцца. На поўначы яны даўгатварыя, блакітнавокія, высокія, на поўдні — з больш акруглымі тварамі. На паўднёвым баку — кірыліца, праваслаўе, славянства, на паўночным — лацініца, каталіцтва, тут жылі балты (гэта праглядаецца і ў мове, і ў знешнім выглядзе, у ментальнасці, поглядах на жыццё). І мяжа існавала тысячагоддзе, яна захоўваецца ў нечым і цяпер. Паўднёвая Лідчына да гэтага часу рэдка жэніцца з паўночнай.

А дату 1180 увёў Тэадор Нарбут. Ён быў не гісторыкам, а пісьменнікам, які займаўся гісторыяй, у яго працах вельмі шмат памылак. Ды і сам выраз, у якім названа гэта лічба, неадназначны па сэнсе, з яго зусім не вынікае, што гэта дата заснавання горада. Горад з'явіўся, калі пачаў будавацца замак. Каб абсталяваць горад, прыехала каля 5 тысяч будаўнікоў. Будаваўся замак — з'явілася і пасяленне. З назвай Ліды таксама ўсё зразумела: Лідэ (гэта слова ёсць і ў літоўскім слоўніку) — гэта месца, дзе высякалі лес. Ліда ўзнікла на рацэ Лідзейцы (шчупаковай рацэ, «лідзейка» — гэта шчупак. Шчупакоў у нас, дзякуй Богу, і было, і цяпер ёсць). А тут прыдумалі дачку Гедыміна, Лідзею, што скакала з вежы. Прыязджаюць экскурсаводы і пачынаюць, стоячы каля сцен замка, распавядаць гэтую легенду. У Гедыміна ўсе дочкі вядомыя, якая можа быць Лідзея? Падобныя легенды з'яўляюцца там, дзе людзям няма чаго сказаць па сваёй гісторыі. Яны ўзніклі за савецкім часам, калі гісторыі да 1917 года не існавала. Падобныя сюжэты ў асноўным тычацца няшчаснага кахання багатай князёўны (княжыча) і беднага хлопца (дзяўчыны), ці распавядаюць пра падземныя хады. Тут была ідэя скульптуру паставіць з Лідзеяй, я нават макет бачыў і пакрыткаваў, сказаў: «Вы што, хочаце ў Лідзе помнік тапельніцы паставіць, каб нашы лідскія дзеўкі з вежы ў возера кідаліся?» І навошта нам такія легенды? Ці яшчэ: хацелі ў Лідскі замак рыцара-блукальніка запусціць. У нас такая багатая сапраўдная гісторыя, столькі цікавага. У Лідзе была легендарная падзея: 71-гадовы Ягайла, вялікі князь і кароль польскі, жэніцца на 17-гадовай дзяўчыне. Гэта ў яго чацвёрты шлюб, і дасюль няма ніводнага сына, нашчадка. І ў гэтай пары нарадзіліся тры сыны. Павінна быць жорсткая праграма па ўстаноўцы помнікаў, бо нам, гісторыкам і экскурсаводам, з гэтым працаваць.

— Бачыла ў вас помнік — камень, на якім надпіс — урывак з завяшчання Гедыміна...

— Ёсць у Лідзе цудоўны скульптар Рычард Груша, які амаль што за ўласны кошт па ўсёй Беларусі ставіць памятныя знакі. І гэты памятны знак ля касцёла ім зроблены. Гэта якраз першы дакумент, у якім узгадваецца Ліда. Надпіс гаворыць, што «Задоўга да жывата свайго» («жывата» тут значыць смерці) Гедымін завяшчаў дзецям гарады, сярод якіх узгадваецца і Ліда. Гедыміна забілі ў 1341-м, а завяшчанне адносіцца да 30-х гадоў. Адкуль дата 1323? У гэты час у дакументах упершыню ўзгадваецца Вільня. І пачынаюць будавацца замкі: Віленскі, Крэўскі, Медніцкі. Гэта серыя замкаў прыкладна падобных, але Лідскі — самы першы, у яго ёсць недахоп, якога пазбеглі пры пабудове ўсіх астатніх. У ім няма высунутых вежаў, якія б дазвалялі весці франтальны абстрэл. Калі вораг дабярэцца да сцен замка, ён трапіць у мёртвую зону (гэта 15-20 метраў), адкуль да яго не дабрацца. І парадокс: менавіта гэты першы замак захаваўся лепш за ўсе астатнія.

«СВЯТА ДУШЫ»

— Як вы ставіцеся да таго, што ў Лідзе з'явіліся вуліцы Грунвальдская, Гедыміна?

— Гэта свята душы. Назвы вуліц мяняліся ў 1920-м палякамі, у 1939-м — Саветамі, у 1941-м — немцамі, у 44-м — зноў Саветамі. Але пазней нічога не адбывалася. І навошта нам гэтыя вуліцы Розы Люксембург, Куйбышава, Чапаева? Неабыякавыя людзі гэтае пытанне ў нашым горадзе не раз узнімалі. Назва Грунвальдская з'явілася ў юбілей Грунвальдскай бітвы, лідская харугва ў ёй удзельнічала. Думка пра бульвар Гедыміна прагучала яшчэ гадоў з 15 таму. Шмат што з таго, пра што я раней выказваўся ў кулуарных колах, пісаў у артыкулах, здзяйсняецца.

— А якія яшчэ маглі з'явіцца назвы ў Лідзе?

— У нас вядомых людзей шмат. Напрыклад, акадэмік, знакаміты фізік Мігдал, Пётр Коган, які быў прэзідэнтам расійскай акадэміі мастацтваў, вядомы ў XIX стагоддзі акцёр Пікарскі, Нарбуты, Кастравіцкія, Гіём Апалінэр, знакаміты талмудыст XVI стагоддзя Давід з Ліды і іншыя. Зараз мы носімся з ідэяй, каб на новым бульвары Гедыміна паставіць помнікі знакамітым людзям з Ліды і наваколля. Вядома ж, тут павінен быць і помнік заснавальніку горада, можа, ён з'явіцца на юбілей Ліды. Безумоўна, павінен прайсці конкурс на стварэнне гэтага помніка.

— Адноўлена вежа замка, гэта добра ці не? Кажуць, поўны навадзел...

— Тут ёсць два падыходы, адзін з іх ЮНЕСКАўскі — лепш нічога не чапаць, другі - аднаўляць выходны матэрыял. На Лідскім замку ўсе рэстаўрацыі добра бачныя: расійская 1908 года, польская 1920, савецкая 70-х і цяперашняя. Яны розняцца па цэгле, іх можна паказваць. Для людзей, хто тут жыве і хто з гэтым працуе, важна мець замак цэлым. Таму што мы там зможам зрабіць музей, праводзіць выставы, пашырым экспазіцыю, у нас ёсць матэрыялы, якія накапалі археолагі. Фарміруем калекцыі, пачынаем тэатралізаваныя паказы. Такім чынам, па-першае, з'явілася дадатковая плошча. Па-другое, замак стаў цэласным, з'яўляецца замкнёнасць прасторы (калі вежа не была адноўлена, вока мулярла шматпавярхоўка, што стаіць недалёка ад замка, цяпер гэта не так заўважна). Неяк ў замку выступала Ірына Дарафеева, дык яна прызналася, што такога адчування, як тут, не было ніколі, сцены задаюць настрой, тут па-асабліваму гучыць музыка. Мы сюды запрашалі ансамблі. Гэта месца, дзе пад адкрытым небам можна ладзіць добрыя мерапрыемствы. Замак запрацуе ў шалёным рытме, будуць рыцарскія бойкі, экскурсіі, адчыніцца трэці музей (адзін працуе на праспекце Перамогі, другі, літаратурны, — побач з замкам, трэці — у замку. Разглядаецца ідэя стварэння чацвёртага музея — музея піва). Вяселлі сюды заязджаюць кожную суботу.

Да таго, як пачаўся рамонт, у замку мы праводзілі «Вяселле Ягайлы», якое карысталася вялікай папулярнасцю. У нас была падстава гэта раскручваць: калі 71-гадовы дзядок і маладзенькая дзяўчына пабраліся шлюбам, яны працягнулі дынастыю Ягелонаў на 150 гадоў, іх нашчадкі правілі Польшчай, Чэхіяй, Венгрыяй. Мы хочам раскруціць гэта далей. На трэцім паверсе ёсць рыцарская зала. У замку мы разыгрываем тэатралізаванае прадстаўленне, спецыяльна на яго едуць з самых далёкіх куткоў Беларусі, тут былі і кітайцы, чэхі, французы. Падчас прадстаўлення адбываецца рыцарскі паядынак — усё па-сапраўднаму, бачна, як іскры ляцяць, ёсць і добрыя мелодыі, танцы, варажба. А цяпер увяліце невялікую плошчу на 30 квадратных метраў, дзе людзі сядзяць на лаўках, блізка адзін ад аднаго, і перад імі адбываецца гэтае дзейства, і ўсё гэта пры свечках. На гэтым не спынімся. Былі моманты, калі да нас на працягу дня прыязджала 16 турыстычных груп, адначасова ішло 8-10 вяселляў, і гэта кола ў нас круцілася так, што да вечара супрацоўнікі музея сіплі, гублялі голас. Нам дапамагае гэта рабіць прыватная турыстычная арганізацыя «Светавід».

— За праграму «Старадаўніх муроў адраджэнне» Лідскі музей атрымаў Прэзідэнцкую прэмію «За духоўнае адраджэнне»...

— А яшчэ некалькі гадоў таму мы былі нікім. Будынак разбураўся. Музей пацёк, падлога разбуралася. Цяпер — гэта адзін з лепшых музеяў, ён цалкам рэстаўраваны. У нас цудоўны калектыў, мы змаглі перахварэць, выстаяць і падняцца. А калі цікава жывецца, можна і на 300 тысяч жыць. У людзей з'явіўся азарт. Музей працуе штодня і столькі, колькі трэба (часам экскурсіі прыязджалі ў 20 гадзін, у 21 — і мы працавалі).

«ПАДНЯЦЬ ЛЮДЗЕЙ»

— Каля замка адноўлена возера — ці не пацярпелі тэрыторыі, на якіх яшчэ не праводзілася археалагічныя даследаванні?

— Там нічога каштоўнага і не павінна быць. А калі б нешта і было, яно б абавязкова мільгала, бо нашы аматары-збіральнікі вельмі актыўныя, яны б не дапусцілі, каб нешта знікла. Тут чысцілі русла Лідзейкі, аматары з мінашукальнікамі некалькі разоў усё «вылізалі». За гэты час, што вяліся работы ля замка, нам прынеслі толькі кавалерыйскую шпагу дзесьці канца XVIII стагоддзя, бутэлечкі. Раскопкі каля самога замка не вяліся, гэтая пляцоўка — будучыня, яе зараўнялі, калі-небудзь яна будзе адкрытая, бо ўсе каштоўныя рэчы яшчэ ў зямлі, зараз бы не хапіла ні сілаў, ні магчымасці гэта падняць. А кожны ж нас з'явілася возера — фантастыка, раней гэта быў цёмны кут, хмызняк, туды ніхто ніколі не хадзіў. Меліяратары адналі возера, а вышэй па цячэнню зрабілі яшчэ адну «цукерачку» — запоўнілі возера, вадаспуск зрабілі. Уяўляю, як летам будзем гуляць па гэтым маршруце. Уздоўж Лідзейкі добрая пешаходная траса, можна турыстаў на лыжаролерную трасу вадзіць, да Лядовага палаца.

— Кажуць, што калі б не Дажынкі, усяго гэтага не было.

— Вельмі шмат залежыць ад канкрэтных людзей. На мой погляд, многае пачалося з аб'яднання горада і раёна. Старшынёй Лідскага райвыканкама назначаны Худык Андрэй Паўлавіч, Бог даў яму талент і энергію, ён вельмі ініцыятыўны чалавек і змог падняць людзей, ён узнімае рэгіён. І адраджэнне музея адбывалася пры ім, ён сабраў за круглым сталом сваіх падначаленых і нас, гісторыкаў: «У нас ёсць такая каштоўнасць як замак, і нічога не робіцца з гэтым». Быў аб'яўлены збор сродкаў, суботнікі праводзіліся, прыбралі тэрыторыю замка, вясной усё пачалося, а ўвосень ужо быў праведзены першы рыцарскі турнір. Спрыяе і тое, што з'явілася дзяржаўная палітыка ў дачыненні да турызму, з'явіліся зацікаўленыя людзі.

— А як вам ідэя, што Дажынкі павінны праходзіць у гарадах, якія маюць гістарычныя аб'екты?

— На мой погляд, усё ж трэба чаргаваць. Таму што гэта каласальнае напружанне сілаў, горад у гэты час увесь нацэлены на падзею. Улады не спяць, не ядуць, і калі яны жывуць, незразумела. Вось наш кіраўнік, начальнік упраўлення культуры райвыканкама Самсонаў Уладзімір Віктаравіч, як кажуць, высах як шчэпка. Акрамя сваёй звычайнай працы, ён працаваў на аб'ектах, за якія адказваў. Дзякуючы Дажынкам мы атрымалі Школу мастацтваў, Дом рамёстваў і Цэнтр творчасці...

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Фокус: палеміка

Калі Радзіма прытуліць маладых і перспектыўных

У нумары «Звязды» за 4 верасня 2010 года выйшаў тэкст «Ці ёсць выбар у маладога і перспектыўнага?» Вось пра што я разважаў у тэксце. З аднаго боку, многія беларусы атрымліваюць бясплатную някепскую адукацыю, з іншага — часам не могуць рэалізаваць сябе на Бацькаўшчыне і з'язджаюць. Хоць некаторыя, якіх апанавала і не адпускае пачуццё патрыятызму, не могуць прыжыцца за мяжой — нават адносна вялікія грошы ім часта прыядаюцца. І зноў жа яны трапляюць у замкнёнае кола — на Радзіме іншы раз сутыкаюцца з несправядлівасцю, малымі магчымасцямі для раскруткі. Якое выйсце з сітуацыі?
Многія чытачы выказалі свае меркаванні па набалелай праблеме. Друкуем самыя цікавыя каментары:

Ханка:

Знаёмая вярнулася днямі з Германіі, збіраецца шукаць працу ў Беларусі. Ведаеце, немцы — не амерыканцы, нянькам шмат не плацяць. Дзяўчына жыла ў доме працадаўцы, даглядала дзіця-інваліда. Маленькі гарадок, нейкія там курсы. Казала мне: «Ні за што не буду там жыць!». Пытаюся: «А калі збіраешся вяртацца?» «Ну, не ведаю, яшчэ паўгода пабуду». Вось такія зазвычай былі размовы. Калі дома нічога не атрымаецца, яна зноўку збіраецца вяртацца туды.

No-avatar:

Раманчукоў, шумчанкаў — плюнуць няма куды. А як справа даходзіць да дробнай кансультацыі — навыперадкі ў райвыканкам *(сапраўды ў тэксце вялася размова пра тое, што дзяржаўныя чыноўнікі павінны спрыяць маладым і ахвочым людзям у развіцці іх пачынанняў. — Аўтар)*.

Сабе ж ці то дыягназ, ці то прысуд падпісваеце, «свядомыя». Дарэчы, якія такія ўмовы патрэбныя для напісання калі не «Гары Потэра», то «Чорнага замка Альшанскага»? Апроч алоўка і кавалка паперы? *(У тэксце пісалася, што творчай моладзі не даюць магчымасці развівацца, як вынік — яркіх імёнаў у літаратуры, музыцы і іншых падобных сферах не з'яўляецца. — Аўтар)*.

Што, зноўку рэжым вінаваты? Ці, можа, калгасны менталітэт суседзяў?

Shurapolyana:

Мне вельмі шкада вас, Яўген, што музыка ў вас асацыюецца з масавай культурай. Магу вас упэўніць, хоць я і не журналіст: у Беларусі дастаткова маладых імёнаў, якія шырока вядомыя не толькі ў нашай краіне. Праўда, яны прадстаўнікі элітнай класічнай культуры: Паначэўны, Стахіевіч, Сінкевіч, Бельцюкова, Бережная, Плігаўка, Палякоў, Гарадзецкі і многія іншыя. Я не буду распісваць іх дасягненні. Мне цікава, ці зможаце вы, як журналіст, знайсці пра іх інфармацыю. Дык, можа, варта змяніць ракурс і звярнуцца да гэтых маладых музыкаў, якія маюць больш перспектыў, чым уся беларуская «папса»?

Ад аўтара. *Пагаджуся з вамі. У кожнай высокаразвітай краіне людзі ведаюць і паважаюць прадстаўнікоў «элітнай» культуры. Скажам, у Барселоне легендарныя оперныя артысты Хасэ Карэрас і Мантсэрат Кабалье зрабіліся не інакш як культурнымі ідаламі. У нас пакуль з усіх шчылінаў часта пруць блатныя бяздарнасці, а на справе яны проста няздольныя дасягнуць папулярнасці. А тым, пра каго вы напісалі, пакуль нашмат цяжэй.*

Юлія:

Наша «талерантнасць» і «добразычлівасць», на маю думку, прагнілы міф. У больш-менш вялікіх гарадах, дзе людзі адно аднаго не ведаюць, — абыякавасць. У правінцыі — адно аднаго брудам паліваюць і смакуюць плёткі. Дзе вы бачылі, каб беларус за беларуса шчыра радаваўся? Я б на гэта паглядзела. А «талерантныя ўсмешкі» — паказуха для тэлебачання і замежных гасцей! Пра цяганіну ў «інстанцыях» і ўзгадваць не хачу. Пра якую дапамогу маладым і перспектыўным у такой сітуацыі можна гаварыць? Зразумела, ніхто нічога гатовага нікому не дасць. Але і ўмоў, каб нечага дабіцца самому, у нас, лічу, мала...

Sova_115:

Ведаеце прымаўку: «Дапамагай таленавітым, а бяздарнасці праб'юцца самі?» На жаль, у высокіх крэслах часта сядзяць такія людзі, якім маладыя і яркія — як костка ў горле! Прыклад з маіх назіранняў. На работу ў навуковую ўстанову спрабуюць уладкавацца два чалавекі: адналькавага ўзросту. Адзін — малады энтузіяст, зацікаўлены сваёй працай. Пра такіх кажуць — перспектыўны. Другі прыйшоў таму, што трэба недзе працаваць. Перавагу аддалі апошняму.

Наглядальнік:

Сам жыў за кардонам два з паловай гады. І далучаюся да таго, што сказаў той наш вучоны з Нідэрландаў: «Ведаеш, чаму мне часта хочацца вярнуцца дадому? Таму што за мяжой мы — ніхто. Грошы ёсць, і ў начальства маеш добрую рэпутацыю, а адчуваеш сябе чужым, пігмеем у баскетбольнай дружыне. Але і вяртацца на заробак у 500 тысяч не хочацца...» *(Сапраўды гэта цытата прыводзілася ў тэксце. — Аўтар)*.

Гэта так. Там можна шмат зарабляць. З табой будуць ветліва абыходзіцца. Але нутром адчуваеш, што ты чужы. Там ты атрымаеш увагу, не прападзеш у выпадку чаго. Мінімум клопату там атрымаць можна, але не больш. Крыўдзіцца на гэта — глупства. Там увогуле ніхто не абавязаны нічога для нас рабіць. Крыўдна стала потым, калі я вярнуўся. І на сабе адчуў, што тут мы... А знаходзімся не ў чужой, а ў сваёй краіне.

Нядаўна выйшаў з кабінета чарговага чыноўніка, які, упіваючыся уладай, мяне «аблаяў». Азарыла: чаму мы не можам дасягнуць таго ўзроўню, што ёсць у Еўропе? Таму што не паважаем адно аднаго і не маем адзінства нашай нацыі. Мы ўсе падзяліліся на нейкія падгрупы і адчайна змагаемся адно з адным. Мы забыліся, што належым да адной сям'і — беларусаў. У кожным сустрэчным бачым не брата па крыві, а патэнцыйнага ворага, які абавязкова нешта ў нас украдзе.

Ад аўтара. *У водгуках, якія мы атрымалі, лічу, дасціпна адлюстраваныя асноўныя нашы праблемы. Чаму ж мы, беларусы, часам не можам прытуліць на сваёй зямлі сваіх жа лепшых прадстаўнікоў? Ды і ўвогуле адчуць сябе паўнавартасным народам?*

Згодны, што перашкаджае гэтаму ў многім з'едлівая зайздрасць адно да аднаго, гэты разбуральны падзел людзей на сваіх і чужых. А такі падыход, у сваю чаргу, прыводзіць да наступнай небяспечнай тэндэнцыі: адказныя людзі падыходзяць да іншых па прынцыпе «свой-чужы», што вядзе да карупцыі, блату і іншага. Але далёка не ўсе адказныя людзі кіруюцца такімі прынцыпамі. І веру, што «каставыя» стэрэатыпы рана ці позна павінны сябе зжыць. І самыя вартыя пабачаць перад сабой зялёнае святло на родных дарогах.

Яўген ВАЛОШЫН.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ООО «СИ-Трейдинг»
за период с 01.01.2009 г. по на 31. 12. 2009 года

УНП 690237128.

АКТИВ	Сумма, млн. руб.	ПАССИВ	Сумма, млн. руб.
I. Внеоборотные активы		**III. Капитал и резервы**	
Основные средства	2328	**Уставный фонд**	5
Нематериальные активы	50	**Целевое финансирование**	18131
Вложения во внеоборотные активы	15301	**Доходы будущих периодов**	490
ИТОГО по разделу I	17679	Добавочный фонд	75
II. Оборотные активы		Нераспределенная прибыль	–
Запасы и затраты	2142		
Налоги по приобретенным активам	1076	ИТОГО по разделу III	18701
Дебиторская задолженность	1404	**IV. Обязательства**	
		Долгосрочные кредиты и займы	5648
		Краткосрочные кредиты и займы	–
Денежные средства	2470	Кредиторская задолженность	422
Финансовые вложения	–	Резервы предстоящих расходов	–
ИТОГО по разделу II	7092	ИТОГО по разделу IV	6070
БАЛАНС	24771	**БАЛАНС**	24771

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01.2009 г. по 31.12.2009 г.

Наименование показателя	Сумма, млн. руб.	Наименование показателя	Сумма, млн. руб.
I. **Доходы и расходы**		Прибыль (убыток)

Свая справа

Сёмае пачуццё Сеня

Сяргей Сень — асоба каларытная. Гэта зразумела амаль з першых хвілін нашага знаёмства. Сяргей Мікалаевіч — чалавек, які любіць сваю родную зямлю, працуе на ёй аддана і шчыра ды пры гэтым стараецца максімальна прыцягнуць свой розум. Кожную справу першапачаткова агледзіць з усіх бакоў, узважыць, прыкіне, які наватарскі падход да яе можна выкарыстаць, і толькі тады пачынае рэалізоўваць.

Сяргей — карэнны жыхар Белавушы. Пасля заканчэння школы ён паступіў у Брэсцкі навучальна-курсавы камбінат, дзе атрымаў спецыяльнасць фатографа.

Два гады ў войсках сувязі ў Архангельску і непрацяглы час работы фотамайстрам у КБА г. Століна прывялі яго назад у родную вёску, дзе Сяргей пачаў займацца вырошчваннем агародніны, продажам яе і нават вывазам у Маскву. Аднойчы знаёмы прапанаваў паступаць у Жыліцкі тэхнікум, каб атрымаць спецыяльнасць агранома. Сяргей і паступіў. На сваім курсе быў старастам, вучыўся добра.

Тэхнікум закончыў з чырвоным дыпломам, пасля работы загадчыкам фермы ў Магілёўскай вобласці зноў вярнуўся на сваю маленькую радзіму.

Тэорыя перамагла на практыцы

Стварыў сям'ю, калі зразумеў, што самастойна зможа забяспечваць яе неабходным.

А неабходнае давала зямля. У 1998 годзе ён напалову з аднавяскоўцам узяў у арэнду тры гектары зямлі. Тады яны вырошчвалі капусту. Са сваіх 0,25 гектара ранняй капусты ён узяў столькі ж, колькі з двух гектараў бульбы.

Стаў глыбей вывучаць тэхналогію вырошчвання капусты. Працаваць з гэтай культурай спадабалася. Стаў арандаваць зямлю разам з братам. Часта па дапамогу звяртаўся да цешчы. Тады і прапанаваў ёй увайсці ў долю. Працэнт ад выручаных ураджаяў дзялілі на часткі.

У справе задзейнічаны ўсе члены невялікай сям'і Сеняў: жонка Святлана, і нават дванаццацігадовы Максім і васьмігадовы Арцём, а таксама маці і бацька Святланы, яе сястра і муж.

Сяргей першы ў Белавушы паспрабаваў вырошчваць капусту пад спандбондам. Перад пакупкай матэрыялу давялося шмат паспрачацца з роднымі, даказваць мэтазгоднасць затрат. І толькі пасля таго, як ураджай быў зняты на два тыдні раней, яны зразумелі, што іх сямейны аграном меў рацыю.

— Тэорыя перамагла на практыцы, — каментуе жыццёвую сітуацыю Сяргей.

У пошуках спандбонду (у той час быў дэфіцытны тавар) Сяргей пазнаёміўся з прадстаўнікамі праекта CORE-Agri.

— Многія мае аднавяскоўцы глядзелі на праект як на магчымасць бясплатна атрымаць насенне, угнаенне. Я ж не прасіў нічога бясплатна. Мне патрэбны былі сродкі ў крэдыт. Тады падлічыў, што на адзін гектар капусты трэба тысяча-паўтары долараў. Праз праграму ўзяў крэдыт. Напачатку невялікі. На наступны год павялічыў яго. Так пакрыху і пачаў развівацца, — расказвае пра этапы свайго станаўлення Сень.

Сёмае пачуццё

Сяргей добра арыентуецца ў рынкавых цэнах, ведае, калі і на колькі павінна падняцца (апусціцца) цана. Напрыклад, сёлета многія з цяжкасцю здавалі капусту па тысячы рублёў, а Сяргей на сваю прадукцыю паставіў цану паўтары тысячы. Тавар у яго заўжды высокай якасці. І ўжо праз некаторы час за яго капустай «стаяла чарга» аптовых пакупнікоў.

А Сяргей, дзякуючы свайму сёмаму пачуццю і пастаянным падлікам, змог атрымаць даход. Самастойна ўзяў у арэнду зямлю. Тры гектары ў першы год не прынеслі ніякага даходу, а пакінулі гаспадара з мінусам у некалькі мільёнаў. Пустазелле не дало культуры нармальна ўрадзіць. І толькі на другі год дагледжаная зямля прынесла добры ўраджай.

Як аграном, Сяргей добра разумее, што на адной зямлі ён не зможа доўга вырошчваць толькі капусту. Стаў шукаць новую культуру. Паспрабаваў цыбулю. Два гады заняў пад яе 30 сотак. Пасадка, апрацоўка гэтай культуры ішлі ўручную. Вельмі цяжка было. Аднак падлічыў, прыкінуў. Выгадна вырошчваць і моркву, аднак з ёй яшчэ больш работы.

Наватар

Палескі менталітэт і наватарскія ідэі змаглі перакананаць Сяргея зноў узяцца за цыбулю. Сёлета пры вырошчванні культуры ён упершыню прымяняў кропельны паліў у адкрытым грунце для вырошчвання цыбулі. І сама стужка паліву знаходзіцца пад зямлёю.

Сяргей разам са сваёй камандай сканструяваў увесь агрэгат, які ўяўляе сабою дзве сеялкі, што адразу сеюць цыбулю і прыкопваюць палівачныя стужкі.

Дарэчы, у гэтага прадпрымальнага чалавека шмат такіх агрэгатаў, якія ён даводзіць да дасканаласці самастойна.

Купіў трактар з неабходнымі прыладамі для апрацоўкі зямлі. Мае міні-трактар з поўным наборам агрэгатаў. Тэхніку набывае разам са сваякамі. Зараз сямейны СВК Сеня складаецца з трох сем'яў, якія разам апрацоўваюць зямлю і прадаюць ураджай. Сяргей тут за галоўнага. Ён і аграном, і эканаміст, і кіраўнік. Бухгалтэрыю вядзе жонка.

На працягу станаўлення асабістай падсобнай гаспадаркі Сеня былі ўсялякія спосабы кааперавання з аднавяскоўцамі, фермерамі, роднымі. Разам бралі ў арэнду зямлю, разам займаліся ўраджаем. Былі і спробы вырошчваць іншыя культуры. Напрыклад, сёлета Сяргей заключыў дагавор на вырошчванне 15 тон кропу. Здаў 10 тон, бо надвор'е «дапамагло» развівацца хваробам. У планах высадзіць азімы часнок. Адна з брэсцкіх фірмаў павінна з дня на дзень паставіць пасадачны матэрыял. Часнок пасля будзе рэалізаваны ім жа.

Сёлета вырасціў нядрэнную цыбулю — ураджай прыкладна 40 тон з гектара пры таварнасці 97 працэнтаў.

Нядаўна Сяргей Мікалаевіч быў на Гарынскім агракамбінаце. У яго папрасілі тэрмінова прадаць для прадпрыемства цыбулю. Прадаў, ды прапанаваў кіраўніцтву заключыць дамоўленасць: забяспечу вас неабходнай колькасцю асноўных культур, калі дапаможаце зямлі ўзяць гектараў 15.

— Фермерам працаваць лягчэй. З задавальненнем перайшоў бы з катэгорыі «асабістай падсобнай гаспадаркі» ў катэгорыю фермераў. Толькі вось зямлі б мне дзе-небудзь недалёка ўзяць, — разважае Сяргей.

Без праблем

Пытаю аб праблемах, з якімі даводзіцца сутыкацца чалавеку, што працуе на зямлі для забеспячэння сябе неабходным.

— Ды ніякіх праблем. Я не з той катэгорыі людзей, якія скардзяцца, што ім не дапамагаюць. Ва ўсім павінна быць здаровая канкурэнцыя. Каму мне скардзіцца, што не пайшла ў мяне капуста? Задыскаваў яе — і далей працую. Гэта мае праблемы, — чую ўпэўнены адказ.

Калі ўзнікаюць пэўныя цяжкасці з матэрыялам, угнаеннямі, хімічнымі прэпаратамі, Сяргей Мікалаевіч тэлефануе ў мясцовы фонд «Цэнтр падтрымкі сельскага развіцця і прадпрымальніцтва Столінскага раёна». «Хлопцы, дапамагайце,» — выраз, які часта чуюць ад яго спецыялісты цэнтра. І дапамагаюць інфармацыяй. Дарэчы, Сяргей з'яўляецца адным з некалькіх кіраўнікоў падсобных гаспадарак, якія сталі заснавальнікамі цэнтра.

Праца з вяскоўцамі

Зараз у Белавушы людзі актыўна капаюць бульбу. Сяргей дапамагае аднавяскоўцам. У яго ёсць капалка, якасць работы якой даволі высокая. Хоць і кошт крыху большы, чым звычайна, але вяскоўцы ўжо на прыкладах пераканаліся, што лепей заплаціць больш, чым пакінуць частку ўраджаю ў зямлі ці дакопваць яго ўручную.

Іншы час дае парады па аграноміі знаёмым. Аднак заўжды з асцярогай: трэба ведаць, каму радзіць, бо іншым часам можаш застацца і вінаватым, хоць былі толькі самыя добрыя намеры. Дае парады тым, хто дапамагае і яму нейкім чынам. А калі чалавек патрабуе кансультацыю, дапамогу толькі ў адзін бок «ты — мне», то гэта ўжо не справа. Абавязкова павінна прысутнічаць «і я — табе».

— Праблема нашых людзей у тым, што яны не гатовыя плаціць за інфармацыю. Хоць іншы раз некалькімі словамі можна выратаваць ураджай, — дзеліцца Сяргей Мікалаевіч.

А сам Сень заўжды за інфармацыю плаціць.

Культура землеўпарадкавання ў Сеня высокая — гэта адзначаюць аграномы раёна. Сяргей актыўна прымае ўдзел у мерапрыемствах па вывучэнні тэхнікі і тэхналогіі вырошчвання агародніны. Нядаўна ў складзе дэлегацыі ўладальнікаў падсобных гаспадарак раёна (арганізатарам паездкі быў Цэнтр падтрымкі сельскага развіцця і прадпрымальніцтва Столінскага раёна) быў на Днях поля, якія прайшлі ў Агрыматка-96 (Мінскі раён), Сігмента (Маладзечанскі раён), Бэйо Задон (Гомельскі раён). Паездкі для абмену вопытам арганізуюцца замежнымі фірмамі. Дэлегацыям прапануецца паглядзець, як наладжана работа на доследных палях. У кожнага бярэ для сябе нешта новае. Напрыклад, нядаўна прымаў удзельнікаў семінараў, што праходзілі на Століншчыне: ён можа многа расказаць пра тэхналогіі, падзяліцца вопытам.

Таццяна СЕГЕН.

Здароўе нацыі

АД ЖОРСТКАЙ ВАДЫ — У НЫРКАХ КАМЯНІ

КАМЯНІ ў нырках і мачавым пузыры — досыць распаўсюджаная сярод беларусаў ва ўзросце ад 30 гадоў паталогія. І адной з асноўных прычын такога становішча спецыялісты называюць высокую жорсткасць пітной вады. Нягледзячы на такую акалічнасць, далёка не ўсе беларусы пакутуюць ад камянёў. Наогул існуе шэраг тэорый адносна прычын узнікнення мочакаменнай хваробы, і, па сутнасці, усе яны не супярэчаць адна адной, паколькі ў кожным канкрэтным выпадку спрацоўваюць адразу некалькі фактараў. Як і ва ўсім свеце, у нашай краіне пастаянна зніжаецца колькасць выпадкаў адкрытага аператыўнага ўмяшання пры лячэнні мочакаменнай хваробы. У абсалютнай большасці выпадкаў камянёў у нырках цяпер пазбаўляюць не інвазіўнымі, не траўматычнымі метадамі, кажа загадчык уралагічнага аддзялення №3 4-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы, кандыдат медыцынскіх навук Дзмітрый МАЛАШЧЫЦКІ.

— Што трэба разумець пад мочакаменнай хваробай?

— Калі мы гаворым пра наяўнасць у нырках ці мачавым пузыры камянёў, нават невялікіх, да 5 мм, ці так званага пяску — памерам 1-2 мм, значыць, мы павінны разумець, што ў чалавека ёсць мочакаменная хвароба. У выніку гэтага захворвання камяні спачатку могуць утварацца ў нырках. У любы момант, у працэсе мочавыдзялення, падчас хады ці нават калі пацыент проста ляжыць на ложку, камень можа пачаць рух і трапіць спачатку ў мачаточнік, які злучае нырку з мачавым пузыром, а пасля і ў мачавы пузыр. Камяні могуць выходзіць самастойна, з мачой, але, бывае, застаюцца ў той жа нырцы, мачаточніку ці мачавым пузыры, і не проста застаюцца, а працягваюць расці. Камяні здольныя ўтварацца і адразу ў мачавым пузыры, што абумоўлена іншымі захворваннямі і паталагічнымі станамі: парушэннем абмену рэчываў, хранічнай затрымкай мачы пры адэноме прастаты, траўмамі пазваночніка. Паталогія можа мець месца і ў выніку парушэння адтоку мачы з нырак, калі яны вылучаюцца анамальнай будовай. Пры парушэнні ж адтоку мачы з мачавога пузыра могуць утварацца другасныя камяні ў нырках.

Наогул камяні бываюць рознымі па форме — каралавідныя, напрыклад; рознага памеру — нават больш за 10 см. Невялікія ўтварэнні, да 5 мм, — мікраліты не маюць клінічнага значэння, хоць бывае, што і 4-міліметровы камень прычыняе боль. Будова і памер каменя з'яўляюцца найбольш важнымі ў сэнсе ўплыву на работу органа.

— Ці можна прадбачыць патэнцыяльна небяспечную сітуацыю, калі камень пачынае рухацца?

— Ніхто не здольны дакладна сказаць, калі камень пачне рухацца.

— Калі ж у такім выпадку лепей займацца выдаленнем каменя?

— Наяўнасць апошняга — паказанне да работы з ім. Від выдалення залежыць ад памеру і месца знаходжання каменя. Чым меншы камень — да 5 мм, тым менш інвазіўнымі будуць метады ўздзеяння на яго. Прызначаюцца, у прыватнасці, мачагонныя зборы і медыкаменты. Камяні памерам ад 5 да 20 мм рэкамендуецца драбніць. Пры буйных утварэннях паказана аператыўнае ўмяшанне або кантактнае драбненне.

Драбніць камяні можна лазерам або ультрагукавым электродам. Найбольш аптымальна — лазерам, паколькі ён дазваляе разбураць і фрагментаваць любыя ўтварэнні. Выпрацоўкі дыстанцыйнае лазернае драбненне, якое генерыруе пэўную ўдарную хвалю і патрабуе высокага прафесіяналізму ад таго, хто выконвае літатрыпсію. Пры дыстанцыйным драбненні камень можа выйсці самастойна або яго фрагменты выдаляюцца непасрэдна падчас гэтай аперацыі. Такая працэдура выконваецца, зразумела, толькі ў нырцы ці мачаточніку, але не ў мачавым пузыры, дзе камяні ніколі не драбняцца дыстанцыйна. Ёсць яшчэ кантактны спосаб драбнення, калі робіцца маленькі пракол, камень драбніцца і адначасова з дапамогай спецыяльнай вадкасці вымываюцца яго фрагменты.

Уся працэдура ад пачатку падрыхтоўкі драбнення да яе поўнага завяршэння доўжыцца каля адной гадзіны. Многае залежыць ад вопыту спецыяліста, месца знаходжання каменя, некаторых іншых фактараў. Тут няма трафарэту, які падыходзіў бы ўсім пацыентам.

— У якіх выпадках даводзіцца прыбягаць да адкрытай аперацыі?

— Колькасць выпадкаў адкрытага аператыўнага ўмяшання пастаянна зніжаецца, і праз нейкі час гэта будуць адзінкавыя сітуацыі. Як правіла, такі від дапамогі патрэбны пры ўскладненні мочакаменнай хваробы, калі пацыент своечасова не звяртаецца да ўролага. Аднойчы ўтвараецца запаленчы працэс, камень блакіруе адток мачы, і тады лепей праводзіць выдаленне адкрытым шляхам. Адкрытая аперацыя прымяняецца і ў выпадку пастаяннага запаленчага працэсу, наяўнасці буйных камянёў, функцыянальных парушэнняў, пры якіх можа спатрэбіцца нават выдаленне ныркі, а дакладней, таго, што ад яе засталося, паколькі захворванне разбурае орган.

— Як доўга пацыенту даводзіцца чакаць працэдуры выдалення каменя?

— Дапусцім, падчас ультрагукавога абследавання ў той жа нырцы выяўляецца камень. Але ён не блакіруе адток мачы, не дае боляў. У прынцыпе, далей пацыенту трэба поўнасцю абследавацца, каб урач-уролаг дакладна вызначыўся з тым, якім чынам пазбавіцца ад гэтага каменя. Часцей за ўсё, як мы ўжо казалі, прызначаецца драбненне. У Мінску на базе нашай клінікі ёсць два адпаведныя апараты. Калі абодва працуюць пастаянна, то ніякай чаргі няма. На сёння яна складае літаральна два-тры дні. Калі працуе толькі адзін апарат, то можа ўтварыцца і чарга.

Калі ж пацыент трапляе ў клініку па хуткай дапамозе, з прыступам болю, то спачатку праводзіцца абследаванне, купіруецца боль, ставіцца дыягназ, і толькі пасля ўрач вызначаецца са спосабам выдалення каменя.

— Ці існуюць іншыя, акрамя ультрагукавога даследавання, спосабы выяўлення камянёў?

— Ёсць яшчэ метад унутрывеннага кантраставання або падвядзення кантраснага рэчыва непасрэдна да месцазнаходжання каменя. А лепш за ўсё можна ўбачыць камень на камп'ютарным тамографе, праўда, такі від даследавання прызначаецца толькі па паказаннях, у спрэчных выпадках, калі цяжка вызначыцца з метадам лячэння.

— Па сваім складзе камяні адрозніваюцца паміж сабой?

— Яны могуць утварацца з розных соляў — фасфатаў, аксалатаў, соляў мачавой або шчаўевай кіслаты. Склад, а таксама кантраснасць і шчыльнасць камянёў будуць важнымі пры вызначэнні з далейшым рэжымам харчавання, ладам жыцця пацыента.

Камяні —канчатковы прадукт мочакаменнай хваробы. Апошняя ж уяўляе сабой комплекс парушэнняў абмену рэчываў. Таму нават калі мы выдалілі камень, хвароба засталася, і верагоднасць утварэння новага каменя застаецца высокай. Аднымі з асноўных фактараў, якія спрыяюць развіццю мочакаменнай хваробы, застаюцца жорсткасць вады, лад харчавання, гарманальны фон арганізма (менавіта функцыя парашчытападобных залоз), а таксама шэраг іншых момантаў. Сваю ролю іграе і спадчыннасць. Безумоўна, рызыка ўзнікнення хваробы ўзрастае, калі ад падобнай праблемы пакутавалі блізкія сваякі.

— У ліку першых фактараў вы назвалі жорсткасць вады — аб'ектыўны фактар, на які, верагодна, цяжка паўплываць...

— Сапраўды, на Беларусі жорсткая вада. Калі накіп на чайніку ўтвараецца хутка, значыць, вада жорсткая, і тое, што мы бачым у чайніку, будзе і ў нашых нырках. Таму трэба выкарыстоўваць добрыя фільтравальныя ўстаноўкі або бутыляваную ваду. Дарэчы, важна не толькі, якую па сваім складзе ваду мы спажываем, але і ў якой колькасці. Чалавек павінен выпіваць 1,5-2 літры вады штодня. І чым вышэй тэмпература паветра, тым больш трэба спажываць. Чым менш мы п'ём, тым менш будзе мачы, і тым больш яна будзе канцэнтраванай. Верагоднасць яе крышталізавання — а значыць, утварэння пяску, а потым і камянёў — узрастае. У гэтым сэнсе існуе паняцце фізіялагічнай нормы. Нармальны дыўрэз — 1,2—1,8 літра ў суткі, ад 6 да 10 разоў.

— Ці можна нашкодзіць ныркам вялікай колькасцю выпітай вады або з'едзеных кавуноў?

— Калі няма ніякага генетычнага парушэння, то ні кавуном, ні вадой ныркі не перагрузіш. Калі ж ёсць нейкі дэфект, меў месца ўралагічны запаленчы працэс, была траўма, якая выклікала адпаведныя функцыянальныя парушэнні, ці ёсць спадчыннае захворванне мочавыдзяляльнай сістэмы, выяўлена хранічная ныркавая недастатковасць, то тады з воднай нагрузкай трэба быць асцярожным.

— Якія напоі, прадукты не спрыяюць здароўю тых жа нырак?

— Да ліку так званых нефратаксічных прадуктаў адносяцца перш за ўсё сурагатныя алкагольныя напоі, дэнатураты, якія выклікаюць пашкоджанне ныркавага эпітэлію, парушаюць фільтрацыю. Нават аднаразовага прыёму памяшканых напояў можа быць дастаткова для таго, каб чалавек трапіў у рэанімацыю і быў пераведзены на гемадыялізе, штучную нырку. Што да якасных алкагольных напояў, то тут ужо справа ў колькасці. Зразумела, для нырак ёсць розніца — келіх віна ці дзве бутэлькі.

Вельмі важна абмяжоўваць такі прадукт, як соль. Прычым з узростам гэтае абмежаванне павінна станавіцца больш жорсткім. Соль прыцягвае ў сасуды лішнюю ваду, а гэта павялічвае нагрузку на сэрца. Павышаецца ціск, што ў сваю чаргу ўплывае на эпітэлій нырак. Атрымліваецца свайго роду шкодны замкнёны круг.

— А што спрыяе лепшаму адтоку мачы, прафілактыцы мочакаменнай хваробы?

— Садавіна-гародніна — кавун, віноград, яблыкі, а таксама адвары такіх мачагонных траў як талакнянка, льняное насенне, лісце брусніц, грушавае лісце і грушавая кара. Траву можна заліць кіпенем у тэрмасе і пакінуць на ноч. Піць пакрысе на працягу дня. Можна перыядычна піць спецыяльныя мачагонныя, ныркавыя зборы, якія прадаюцца ў аптэчнай сетцы.

Для пацыентаў з мочакаменнай хваробай распрацаваныя спецыяльныя рэкамендацыі па харчаванні. Так, тым, **хто пакутуе ад аксалурыі, рэкамендуецца** ўжываць белакачанную, брусельскую, квяцістую капусту, гарбуз, агуркі, гарох, баклажаны, абрыкосы, бананы, грушы, віноград, усе віды круп, белы хлеб, алей, малочныя прадукты і мяса. Выдаляюцца з рацыёну какава, шакалад, буракі, сельдэрэй, шпінат, шчаўе, пятрушка, булёны.

Пацыентам з уратурыяй рэкамендуюцца белакачанная і квяцістая капуста, грэцкія, аўсяныя, прасяныя крупы, рыс, фрукты, сок лімона, курага, чарнасліў, марская капуста, пшанічнае вотруб'е, сметанковае масла і алей, хлеб пшанічны і жытні з мукі грубага памолу, нятлустае мяса, адвараная рыба, малочныя прадукты, яйкі, адвары ячменю, аўса. Выдаляюцца з рацыёну какава, кава, моцны чай, шакалад, сардзіны, селядзец, траска, шпроты, тлустая рыба, свініна, бараніна, субпрадукты (печань, ныркі, мазгі), трус, курыца, шпінат, брусельская капуста, мясныя і рыбныя булёны.

Нарэшце, **пацыентам з фасфатурыяй рэкамендуюцца** сметанковае масла, алей, манныя крупы, рыс, макарона, мука вышэйшага і 1 гатунку, бульба, капуста, морква, агуркі, буракі, таматы, кавуны, абрыкосы, вішня, грушы, сліва, клубніцы. Выдаляюцца з харчавання сыр, тварог, курыца, рыба, ікра, фасоля, гарох, шакалад, аўсяныя, грэцкія, ячныя і прасяныя крупы, шчолачныя мінеральныя воды.

Святлана БАРЫСЕНКА.

КРЫЛАТЫ... КАБАН

На Палессі што ні вёска, то свая гаворка. Але ж разумееш гэта толькі тады, калі ўжо паездзіш па іх, альбо доўга пажывеш на свеце. А тут зусім маладая дзяўчына з Лагойшчыны выйшла замуж у вёску Язвінкі, прыехала да свекрыві пагасціць і тое-сёе дапамагчы па гаспадарцы. Вечарам спаць лягла, а ранкам прачынаецца і чуе:

— Во паскудны кабан, во гад! Зноў цераз плот пераляцеў, зноў усе градкі здзёр! Ну, пачакай, я табе крылы абшарашу — па самае нельга...

Ляжыць нявестка і думае: «Колькі на свеце жыву, ніколі не чула, каб у кабана ды крылы былі».

Штурхель мужыка пад бок:

— Паслухай, Сцяпан, маці твая нейкага парсюка лае, кажа, што ён цераз плот пераляцеў... Дык што ў вас за свінні такія?

Муж у адказ як зарагоча:

— Дык гэта ж кабаном у нас пеўня завуць!

Што называецца — век жыві, век вучыся!

Сцяпан Нефідовіч,
в. Любань, Лунінецкі раён

ЯЗЫК МОЙ — ВОРАГ...

Ёсць такая армейская байка. Прапаршчык вучыць жыццю навабранцаў, кажа: «У салдата павінны быць люмінявая міска, люмінявая лыжка, люмінявая кружка. Пытанні ёсць?»

— Ёсць, — адзываецца са строю малады баец. — Трэба казаць алюмініевая лыжка, алюмініевая міска...

— Шыбка граматны? — пытае ў яго прапаршчык.

— Іменна так!

— Адукацыя?

— Вышэйшая тэхнічная.

— Што і «корни извлекать умеешь»?

— Умею, таварыш прапаршчык.

— То ўсім вольна. А ты, разумнік, бяры лом і рыдлёўку. Праца па спецыяльнасці: будзеш карані «извлекать» — вунь тыя пні раскарчоўваць.

...Гэту бываліцу я міжволі ўспомніў, калі пляменніца стала распавядаць пра свайго сына. Ён у яе маладзец — паступіў у ліцэй Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. І вось у іх там першае пастраенне — знаёмства з новым класным кіраўніком:

— З сённяшняга дня, — кажа той (у званні афіцэра), — я для вас буду і бацькам, і маці...

— І цяпер вас мы будзем віншаваць з Днём абаронцаў Айчыны і з 8-м Сакавіка? — спытаў сын пляменніцы...

Класны, акурат як той прапаршчык, загадаў хлопцу выйсці са строю, спытаў прозвішча...

— Запомніў, нябось... І цяпер заганяе, далібог заганяе! — баялася матуля.

Але ж, як быццам, усё абышлося. Хлопец ужо год адвучыўся, атрымаў першае званне (малодшы сяржант) і першую пасаду — камандзіра аддзялення, памочніка таго самага класнага. Так што язык — ён, безумоўна ж, вораг, але, як высвятляецца, не заўсёды.

Валерый Гаўрыш, *г. Чавусы*

СКАЗ НЕ ПРА БЕЛАГА БЫЧКА

Гісторыя гэта адбылася ў адным з невялічкіх гарадоў і, як кажуць, пры савецкім часе.

У модзе тады былі штогадовыя сельскагаспадарчыя выставы-кірмашы.

Што выстаўлялася? Вядома ж — нашы дасягненні. Што прадавалася? Розныя тавары плюс садавіна, гародніна... Карацей, выгадна было — і людзям, і арганізатарам.

Але ж у той год яны, гэтыя арганізатары, захацелі не проста выгады, а, як кажуць цяпер, «стопудовай», «суперскай»...

І прыдумалі ж як яе, вось такую, займець! Па-першае, трэба арганізаваць бяспройгрышную латарэю і ў якасці галоўнага прыза — ну, каб стымул быў удзельнічаць, квіткі купляць — выставіць нешта істотнае (напрыклад, вялікага бычка). Па-другое, трэба білетаў тых выпусціць намнога больш, чым каштуюць прызы. Па-трэцяе, рэкламу зрабіць... А галоўнае — білет той, з бычком, аддаць «свайму чалавеку», які ў самым канцы свята выцягне нейкі квіток з агульнай масы, схавае ў кішэню, а адтуль выцягне шчаслівы...

Усё, здаецца, прадумалі.

І вось розыгрыш пачаўся. Білеты былі дарагаватыя, але ж бяспройгрышныя: не моркву — дык капусту чалавек выйграваў! Па плане, як быццам?

Але... не да канца, бо ўзяў і завітаў на той кірмаш дырэктар аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў — чалавек досыць азартны (да таго ж нападпітку), але і з галавой, гаспадарнік. Адразу ж прыкінуў, колькі засталося білетаў, падлічыў іх кошт. Тут жа скеміў, што бычок каштуе, як мінімум, удвая даражэй... Значыць, варта браць...

Да таго ж і грошы ў кішэні былі (хіба трошкі пазычыў). Так што купіў ён адразу... усе білеты. Стаў адкрываць (тут жа знайшліся памочнікі), а там усё па-ранейшаму — не морква дык капуста. Дзе бычок? Ня-ма?!

Хмель у дырэктара як рукою зняло. «Ганьба! Абман! — зашумела грамада. — Міліцыю сюды трэба! Народны кантроль!»

Але тут замест іх на «сцэну» выпаўз «свой чалавек» — дзед з білетам. Кажа:

— Вось... У мяне выйгрыш! Я яго... не разгледзеў.

...Прыйшлося паказаць — і таму шчасліваму дзеду, і арганізатарам... Надоўга запомняць, што нельга падманваць людзей, бо няма нічога таемнага, што не стала б яўным.

К.К., *Гродзенская вобласць*
(Не падпісваюся, бо вельмі многа людзей былі сведкамі гэтай гісторыі)

АБЯЦАНКА-ЦАЦАНКА...

Мой добры знаёмец Аркадзь да цешчы ездзіў не часта. Але ж госцем быў вельмі дарагім, а ўжо чаканым... Ад напіткаў-наедкаў стол аж трашчаў.

...Толькі за яго паселі ў той раз, бяседу пачалі — цётка Тадорка ў хату! Хоць дзясятая вада на кісялі, але ж сваячка. Дзявацца няма куды — прыставілі яшчэ адну табурэтку, чарку налілі. Тая перакуліла ды і кажа:

— Свіння ў мяне апарасілася надоечы, дык зайшла во параіцца, як парасят падзяліць. Ганьбы сваёй кабанчыка дам. І Нюрцы (гэта — цётчыны дочкі. — **Аўт.**). Сабе, рашыла, парачку пакіну. Ці нават трое... Брату кабанчыка падкінуць трэба. Ну, і вы ж таксама радня мне, — то вам — парсючка (гаспадар на гэтым слове да краёў наліў у цётчыну чарку... Яна кульнула, але не змоўкла)... І госцікам жа вашым, дачушцы з зяцем, хоць бы па свінячы трэба даць?

Гаспадар зноў напоўніў Тадорчыну чарку, гаспадыня бліжэй да цёткі падставіла талеркі з прысмакамі. Кабета выпіла, прыкусіла, хацела, мусіць, далей прадоўжыць сваю дзяльбу, ды госць (зяць), збіўшыся з падліку, спытаў:

— А колькі ж усяго парасятак?

— Ды пяцёра, — нічога не падазраючы прамовіла цётка, водзячы вачыма па талерках у пошуку чаго-небудзь смачнага.

— А кабанчыкаў колькі?

— Двое. І трое свінак ...

— Дык пойдзем мо, цётка, — усміхаецца зяць, — я на сваіх пагляджу ды нечым памечу, каб вы іх іншым не аддалі.

І як быццам з-за стала ўстае.

Але ж цётка яго апярэдзіла: як ветрам яе садзьмула:

— Іншым разам, дзеткі, іншым разам! Зараз — работы край: травы з балота прынесці...

Толькі Тадорку і бачылі.

— Дурань стары, навошта ёй наліваў?! — стала сварыцца на мужа цешча.

— А ты, можна падумаць, разумная? — адбіваўся той. — Талеркі ёй падстаўляла...

— Дык вы што — ведалі, што яна падманвае? — здзівіўся зяць.

— А як жа! — зашумелі гаспадары. — Уся вёска ведае! Во такая яна — хітрая, што ліса: як толькі знюхала, што госці ў каго, — следам бяжыць... І тады ўжо лістом сцелецца: тое зраблю вам, тое аддам. У наступны раз выганім — ну, далібог!..

Цесць з цешчай гэта паабяцалі, а вось «выгнаў» падманшчыцу зяць. Прытым вельмі прыгожа.

Праз колькі там часу прыехаў ён да цешчы яшчэ раз. Толькі павітаўся, толькі сеў за стол ды лыжку ўзяў — цётка Тадорка, тут як тут. Таксама садзіцца. І... сваю ранейшую пласцінку заводзіць, кажа:

— А ў мяне ж надоечы свіння апарасілася. Дык я во параіцца прыйшла...

— От добра цётка, што прыйшлі... І што пра свінак сваіх гамонку завялі, — пахваліў госць сваячку. — Нашы ж там таксама падраслі? Дык я во прыехаў... Хоць адну забяру...

— Іншым разам, іншым разам! — залапатала цётка. — Зараз работы край...

А сама задам, задам — ды з хаты. Толькі яе і бачылі.

Раіса Васільева, *г. Гомель*
Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.
Ад яе ж заўсёднае: «Пішыце! І не забудзьцеся падпісацца».

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 4 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмельніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць міксер, кухонную ЭЛ-машыну, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **7 кастрычніка 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 кастрычніка 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 снежня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 01.09.10 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 1.09.10 па 31.12.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1754 ад 27.08.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

7 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на IV кв. або 2-е паўг. 2010 года**

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ» на 2010 год па месяцах

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:

(індэкс выдання)

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | перааграсоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

НОЧ, ЗАПРАЎКА, ПІСТАЛЕТ

22 верасня а палове другой гадзіны ночы на АЗС, што знаходзіцца на вуліцы Першамайская ў Магілёве, зайшоў невядомы малады чалавек. Пад пагрозай пісталета ён запатрабаваў у дзвюх жанчын-аператараў пачку цыгарэт і 50 тысяч рублёў.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (17 верасня). Па гарызанталі: Медуза. Драч. Плуг. Тол. Абак. Амальгама. Амар. Хабар. Пара. Сотня. Ата. Эпігон. Кай. Дрэва. Рапіра. Стан. Цэх. Пуга. Здрада. Ферма. Урду. Рэп. Лато. Тло. Рак. Дранік. Гета. Аган. Шыла. Трактар. **Па вертыкалі:** Сеанс. Дэльфін. Антрэ. Спрут. Вотум. «Ява». Агарод. Альт. Хна. Аха. Прагал. Дыпламат. Анега. Баба. Ракіта. Акула. Кант. Карэц. Зух. Бард. Лапік. Рол. Рагавіца. Рой. Рэдут. Кран. Даха. Омметр.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

70-ГОДДЗЕ МАЙСТРА

Яго нядаўна справіў знакаміты шашыст Вячаслаў Палянскі. Ён падарыў прыхільнікам старадаўняй гульні шмат змястоўных партый. Яны падабаюцца не толькі практыкам, але і складальнікам канструкцый на 64-клетачнай дошцы. Майстар ФМЖД па кампазіцыі Барыс Іваноў (Мінск) прысвячае яму сваю задачу:



Белыя: f2, f4, f6, h6, дамкі a3, d8 (6). **Чорныя**: c5, d6, h8, дамка h4 (4). Замкнуць простую чорных.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7/20



Белыя: a1, b2, b6, c7, g3 (5). **Чорныя**: a5, b4, d2, e5, g5, h2 (6). Выйгрыш.

АЎТАРСКІ-11/8



Белыя: 12, 17, 23, 30, 32, 34, 36, 37, 40, 41, 43, 44 (12). **Чорныя**: 3, 6, 10, 11, 13, 14, 15, 19, 22, 28, 29, 35 (12).

Уладзімір Матус (Масква) прапануе правесці за белых яшчэ адну цудоўную камбінацыю.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны: два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

ДВА ПЕРАМОЖЦЫ

Усе 16 заданняў аўтарскага конкурсу-9 У. Матуса правільна рашылі: А. Янчук (Камянец), С. Нячаеў (Баранавічы), У. Сапяжынскі (Рагачоў, А. Белы і П. Шклудаў (Наваполацк), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Клімавічы), І. Астроўскі, В. Шульга і А. Літвінаў (Мінск), С. Бурко (Орша), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), У. Статкевіч (пас. Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), І. Працук (Пастравы), В. Голас (Любань), Д. Камчыцкі (Магілёў), Б. Завадскі (Брэст), М. Саўкін (п/а Суднікі Валожынскага раёна), А. Цішураў (пас. Друцк Талачынскага раёна) і інш.

А лаўрэатамі сталі Аляксандр Кіслы (Узда) і Канстанцін Козел (Гродна). Першы дадаткова прывёў 1. 7-2 24:44 2. 2:9 16:18 3. 9:31/34:43 і г. д. у заданні № 7, другі — 1. 13-8/12-8 у заданні № 14. Абодва будуць адзначаны.

Наш кансультант Эддзі Акер (Галандыя) паведаміў па электроннай пошце, што першае заданне паўтарае мініяцюру С. Кавалёва (рыжскі часопіс «Шашкі» № 11 за 1978 год), а другое — М. Левандоўскага (газета «Белорусская нива» за 13.05.2009 г.).

«Атрымаў прыз за аўтарскі конкурс-8 П. Шклудава, — піша Іван Іванавіч Астроўскі — дацэнт Беларускага дзяржуніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, прафесар Ваенная акадэміі Рэспублікі Беларусь. — А памятаеце, як я пачынаў? Зусім нявопытным. Доўга біўся над задачамі. Пры надзвычайнай занятасці. І вось — у ліку пераможцаў! Што і казаць, прыемна. Шашкі сталі часткай майго жыцця. Быць апантаным чалавекам — цікава!».

Усміхнемся!

Прысуд: 11 гадоў школьнага рэжыму з канфіскацыяй цацак.

☺

Цешча каля машыны перад дамам. Зяць з акна:

— Мама, куды гэта вы сабраліся?

— На могілкі, сынок.

— А хто машыну потым дадому прыгоніць?!

☺

Рэвалюцыя ў геннай інжынерыі! Першы ўдалы вопыт злучэння жывёлы і расліны — селядзец з цыбуляй!

☺

Абавязкова аддайце дзіця ў дзіцячы садок, хоць на пару тыдняў.

Потым спакойна зможаце растлумачыць гасцям, дзе ён вывучыў гэтыя словы.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Стасункі неабходны Стральцам як паветра, а Вадалеям трэба пазбягаць канфліктаў

ВАЕН. Будзьце больш асцярожныя ў дачыненні калег і сяброў, бо яны могуць вас падвесці ці справакаваць на непатрэбную фінансавую рызыку. Сітуацыя, якая склалася, будзе здавацца невырашальнай да таго часу, пакуль не дагадаецеся пакапацца ў памяці. Штосьці падобнае ўжо мела месца — так што зможаце скарыстацца вопытам мінулых дзён. Каб тыдзень апынуўся спрыяльным, не варта расказваць пра свае планы навакольным. Гэта гарантуе своечасовае ажыццяўленне таго, што задумалі.

ЦЯЛЕЦ. Вас будуць перапаўняць творчыя ідэі. Спатрэбяцца аднадумцы, якія дапамаглі б іх ажыццяўленню. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі — гэта дазволіць пазбегнуць многіх памылак. Верагодна вырашэнне практычна ўсіх канфліктаў. Серада спрыяльная для прасоўвання па службе. У пятніцу пастарайцеся аб'ектыўна разлічыць свае сілы, не пераацаніце магчымасці. Ёсць верагоднасць паездкі за мяжу, якая станоўча адаб'ецца на вашым лёсе.

БЛІЗНЯТЫ. Каб пазбегнуць ускладненняў ў розных галінах, пажадана заняцца штодзённымі бягучымі справамі. У панядзелак неабходна складсці рэальны план на ўвесь тыдзень. Пастарайцеся не ўпадаць у дэпрэсію, ганіце ад сябе прэч сумныя думкі. Уменне знайсці агульную мову з рознымі людзьмі можа прынесці прыбытак. Для паспяховай рэалізацыі планаў трэба сабраць увесь свой аптымізм і не дазваляць упартасці сапсаваць усю справу. Пры гэтым варта ўважліва ставіцца да свайго здароўя.

РАК. На працягу амаль усяго тыдня вам будзе шанцаваць, так што сканцэнтруйцеся на галоўным. Старайцеся менш пра сябе расказваць, бо гэтая інфармацыя можа стаць крыніцай плётак. Прыслухайцеся да інтуіцыі і творча падыходзьце да любой справы, тады ў канцы тыдня ўбачыце адчувальныя вынікі. З начальствам лепш не сустракацца, бо захочацца яго пакрытыкаваць, а яму — праверыць якасць вашай работы. Будзьце абаяльнымі і добразычлівымі, і людзі дапамогуць вам у многім.

ЛЕЎ. Давядзецца змагацца за ўмацаванне свайго аўтарытэту. Неабходна будзе даказваць, што вы здольны пераадольваць цяжкасці. Пастарайцеся ў другой палове тыдня пазбягаць кантактаў з дзелавымі партнёрамі: вялікая рызыка з-за дробязі разбурыць шматабяцальныя сувязі. Вашу кампетэнтнасць могуць выпрабоўваць — не эканомце час на вывучэнні даведачнай літаратуры. Абапірацца выключна на тое, што і так ведаеце, не варта, асабістага досведу можа і не хапіць. Вас будуць правакаваць на высвятленне адносін — пастарайцеся не ўступаць у канфлікты, тым больш з блізкімі і дарагімі людзьмі, інакш можаце надоўга пасварыцца.

ДЗЕВА. Тыдзень добры для тых, хто аддае перавагу актыўнаму ладу жыцця. Ён прыдатны для творчасці, але патрабуе рухомасці. Не бойцеся рызыкаваць — удача ад вас, хутчэй за ўсё, не адвернецца. Важна не адмаўляць у адказ на просьбу і выконваць работу, за якую бярэцеся, своечасова. Родныя могуць быць пакрыўджаныя на надуманы недахоп увагі з вашага боку. Пастарайцеся праявіць максімальную карэктнасць і абачлівасць пры зносінах з імі. Пастарайцеся стрымліваць раздражняльнасць, інакш у эмацыянальным парыве наломіце дроў на пару ацяпляльных сезонаў наперад.

ШАЛІ. Тыдзень поўны актыўнасці, нечаканых сустрэч і спрыяльных абставін. Будзеце актыўнымі ў імкненнях і непрыхільнымі ў праяўленні асабістай волі. Блізкім людзям захочацца хоць як-небудзь дапамагчы вам у прасоўванні да жаданых мэтаў. У сярэдзіне тыдня пастарайцеся адмовіцца ад паездак і не пускаць у дом чужых людзей. Пазбягайце перагрузак на рабоце: залішняя занятасць не толькі не пакіне часу, каб радавацца жыццю, але і можа негатыўна адбіцца на здароўі. У чацвер вас можа наведаць расчараванне, але ўжо наступны дзень узніме настрой. Навакольныя будуць заінтрыгаваныя вашымі неверагоднымі перападамі настрою.

СКАРПІЁН. Сіняя птушка ўдачы можа заляцець проста ў рукі. Зараз важна не спалохацца раптоўнага поспеху і не пачаць мітусіцца на радасцях. У прафесійнай галіне можна чакаць прыемных сюрпрызаў. Ідэя, якая ажыццявілася, пачне прыносіць вынікі. Вы можаце адкрыць для сябе новыя творчыя аспекты, але ўлічыце, што для гэтага неабходныя цішыня і камфортная абстаноўка.

СТРАЛЕЦ. Не замыкайцеся ў сябе і не пераўтварайцеся ў рака-пустэльніка. Стасункі вам неабходныя, няхай нават самыя мінімальныя. З'явіцца магчымасць істотна пашырыць свае дзелавыя перспектывы. А вашы здольнасці і ўменне рацыянальна размяркоўваць час і будаваць канструктыўныя планы станоўча адаб'юцца на выніках любой дзейнасці.

КАЗЯРОГ. Неабходна паказаць сябе, ды так, каб вас заўважылі і падтрымалі тыя, ад каго вы маглі б атрымаць дапамогу ў бліжэйшы час. Не саромейцеся пры выпадку карэктна падкрэсліць сваю незаменнасць на працы. Актывізуйце ўсе рэсурсы таварыскасці: вам будзе патрэбна інфармацыя, а надзейны спосаб яе атрымаць — шчыра паразмаўляць з супрацоўнікамі. Спяшайцеся пазнаваць новае, больш чытайце і знаёмцеся з новымі людзьмі. Важная інфармацыя ці навіна здалёк моцна паўплывае на ваша жыццё.

ВАДАЛЕЙ. Нядрэнны тыдзень для прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Вы і без таго ўмееце трымаць сябе ў людзях, а зараз вам у гэтым мастацтве проста не будзе роўных, што не можа не звярнуць на сябе ўвагі зацікаўленых людзей. Накіруйце частку сілаў на павышэнне свайго прафесійнага статусу. Калі не хочаце нарвацца на непрыемнасці, не давайце нагоды для канфлікту. Будуць лёгка ўдавацца справы, якія звязаны з праявай асабістай ініцыятывы.

РЫБЫ. На першы план выходзіць работа — магчыма, будзе мноства важных і неадкладных заданняў. Тыдзень раптоўна можа ўцягнуць вас у вір падзей: актыўную перапіску з дзелавымі партнёрамі, сустрэчы з людзьмі, якія вас цікавяць, кароткатэрміновыя паездкі. Спатрэбіцца маса намаганняў, каб справіцца з імі, пры гэтым начальства можа так і не ацаніць вашай стараннасці. Неабходна пачаць рэалізацыю сваіх планаў, інакш можаце згубіць спрыяльны момант для іх далейшага развіцця. Здольнасць адэкватна ацэньваць сітуацыю можа значна знізіцца, таму будзьце больш уважлівымі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.00	19.01	12.01
Віцебск —	6.50	18.51	12.01
Магілёў —	6.50	18.51	12.01
Гомель —	6.47	18.48	12.01
Гродна —	7.15	19.17	12.02
Брэст —	7.16	19.17	12.01

Месяц

Поўня 23 верасня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Дзмітрыя, Сямёна, Фёдара, Юльяна.*

К. *Амеліі, Аўрэліі, Святаполка, Сяргея, Уладзіслава.*

Фота Ілі ВАКУЛІЧА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

25 верасня

1765 год — нарадзіўся Міхал Клеафас Агінскі, дыпламат, кампазітар, вялікі падскарбі літоўскі. Прадстаўнік старадаўняга магнацкага роду: яго бацька, Андрэй, быў ваяводам троцкім, маці, Паўла — з роду магнатаў Шэмбекаў.

Нарадзіўся ў Гузаве, недалёка ад Варшавы. Атрымаў добрую дамашнюю адукацыю, меў выдатныя здольнасці да музыкі і замежных моў. У 1786 пасол на сейме, у 1788 камісар скарбовай камісіі Вялікага Княства Літоўскага, у 1789 літоўскі мечнік, надзвычайны пасланнік у Галандыі. Быў дэпутатам Гродзенскага сейма 1793 года. У 1794 годзе ўдзельнічаў у паўстанні пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, уваходзіў у Найвышэйшую раду літоўскага народа. Ахвяраваў на патрэбы паўстання 188 тыс. злотых, кіраваў 480 стральцамі. Двойчы са сваім атрадам спрабаваў прабіцца ў Мінскую губерню, каб падняць паўстанне. Змагаўся супраць прускіх войск. Пасля таго як расійскія войскі ўзялі Вільню, Агінскі выехаў у Варшаву. За ўдзел у паўстанні яго маёнткі былі канфіскаваны царскімі ўладамі. Жыў у Вене, Венецыі, Парыжы. Дзякуючы намаганням князя А. Чартарыйскага атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму і ў Гродне прысягнуў на вернасць Аляксандру I. У 1802-06 гадах жыў у маёнтку Залессе Ашмянскага павета, дзе пабудаваў новы палац, парк у англійскім стылі, аранжарэі, звярынец, сабраў вялікую бібліятэку. Залессе стала адной з найпрыгажэйшых магнацкіх рэзідэнцый на Беларусі. У 1807 у Італіі быў прыняты Напалеонам I. У 1810 у Пецярбургу атрымаў ад цара званне сенатара і тайнага саветніка, ордэны Св. Уладзіміра і Аляксандра Неўскага. Вядомы як музыкант і кампазітар. Агінскі захапляўся італьянскай і французскай операй, іграў на скрыпцы і клавікордах. Кампазітарскую дзейнасць пачаў у 1790-я гады стварэннем шматлікіх маршаў і баявых песень, пашыраных сярод паўстанцаў 1794 года. Яму прыпісваецца аўтарства музыкі песні «Ашчэ Польшча не загінула», якая стала польскім нацыянальным гімнам. У залескі перыяд пераважна займаўся музыкай; у гэты час напісаны славуты паланэз «Развітанне з Радзімай». Галоўнае ў творчай спадчыне Агінскага — фартэпіянныя п'есы, паланэзы, мазуркі, маршы, вальсы і рамансы.

1555 год — заключаны Аўгсбургскі рэлігійны мір, які прызнаў пратэстанцтва афіцыйнай рэлігіяй.

Цытата дня:

«Для кожнай чалавечай праблемы ёсць прыгожае і простае рашэнне. І рашэнне гэтае заўсёды няправільнае».

Генры Менкен (1880-1956), амерыканскі публіцыст.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ГАСПАДЫНЯМ НА ЗАМЕТКУ

Якая апрацоўчая дошка лепшая

НА КУХНІ ПАВІННА БЫЦЬ МІНІМУМ 4 ДОШКІ

Па гігіенічных нормах мінімальна дапушчальная колькасць — 12. Мала хто пагодзіцца мець дома такі шырокі арсенал. Таму абмяжуемся чатырма: адна — для рыбы, другая — для сырога мяса і птушкі, трэцяя — для хлеба, чацвёртая — для ўсяго астатняга (гародніна, сыр, каўбасныя вырабы і г.д.). Для сырых прадуктаў і мяса лепш падыходзіць пластык, для тэрмічна апрацаваных — дрэва.

САМАЯ ЗРУЧНАЯ ФОРМА — ПРАМАВУГОЛЬНАЯ

Самая зручная ў выкарыстанні — класічная прамавугольная форма. Астатнія падыходзяць больш для сервіроўкі.

САМЫ ЗРУЧНЫ ПАМЕР — СЯРЭДНІ

Для рыбы і мяса памер дошкі павінен быць не менш як 30х50 см, для астатніх прадуктаў — 20х30 см. З маленькай прадукты будуць звальвацца падчас рэзання, а занадта вялікія нязручна мыць і захоўваць.

КОЛЕРЫ — БЕЛЫ, ШЭРЫ, КАРЫЧНЕВЫ, ЧОРНЫ

Толькі такія колеры дазволяць ацаніць натуральнае адценне прадукту на зрэзе і такім чынам разглядзець яго магчымыя недахопы.

ТАЎШЧЫНЯ ДОШКІ — У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД НАГРУЗКІ

Калі для паўсядзённага рэзання падыходзяць звычайныя дошкі таўшчынёй 5-10 мм, то для павышаных нагрузак (калі неабходна парэзаць і пасячы мяса з косткамі) запатрабуюцца дошкі больш тоўстыя (ад 3 см).

ДРЭВА

Самыя танныя і нізкапробныя — дошкі з мяккага дрэва: сасны або бярозы. Больш бяспечныя і зручныя — з цвёрдых парод: дубу, акацыі, буку і бамбуку. Яны хоць і на парадак даражэйшыя, затое практычна не ўбіраюць пахі і вільгаць і не тупяць нож. Самыя дарагія — дубовыя дошкі. Але перш чым плаціць немалыя грошы за дошку з цвёрдых парод, паглядзіце, зроблена яна з суцэльнага кавалка дрэва або з клеенай драўніны. Другі варыянт больш пераважны. Такая дошка менш схільная да дэфармацыі ад вады, а значыць праслужыць даўжэй.

Карысная парада

Пасля кожнага ўжывання драўляную дошку прамываюць пад гарачай вадой з мыйным сродкам. Пасля гэтага яе высушваюць у падвешаным стане. Дрэва «не сябруе» з посудамыйнай машынай і ад такой аўтаматычнай «памывачнай» вельмі хутка прыходзіць у непрыдатнасць.

ПЛАСТЫК (ПОЛІПРАПІЛЕН)

Гэты матэрыял больш лёгкі, трывалы і бяспечны, чым дрэва, не баіцца вады і посудамыйнай машыны. Аднак гэта датычыцца толькі якасных сертыфікаваных дошак, кошт якіх супастаўны з коштам за добрую драўляную дошку. У іх — шурпатая паверхня, аб якую не тупяцца нажы і на якой не слізгаюць прадукты, і абавязкова ёсць канаўкі для сцёку соку. Танны пластык, хімічны склад якога вы ніколі не даведаецеся, лепш не браць: ён хутка пакрываецца парэзамі, а гэта — вялікая рызыка, што яго часціцы трапяць у ежу.

ШКЛО

Калі вас не бянтэжыць скрыгат металу па шкле — то шкляная дошка для вас. Шкло лічыцца самым гігіенічным матэрыялам, аднак не кожны гагодзіцца зачыніць вочы на недахопы такой дошкі: металічны скрыгат, неабходнасць частага завострывання нажоў і лоўлі прадуктаў, якія імкнуцца «выслізнуць» з гладкай паверхні. Выбірайце мадэль з гарачатрывалага шкла з гумовымі ножкамі для шчыльнага прылягання да стала. Такую дошку вы зможаце выкарыстаць і ў якасці падстаўкі пад гарачае.

-2690-

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

Каб не заблудзіцца ў касметычцы

Часта раніцай у нас усяго 10 хвілін на тое, каб прывесці сябе ў парадак і выскачыць з дому, а на пошукі патрэбных ценяў у мешаніне шуфляды або касметычкі няма ні секунды. Каб не губляць час, зрабіце для хатняй дэкаратыўнай касметыкі спецыяльную сістэму захоўвання з кучай дробных аддзяленняў. Для гэтай мэты выдатна падыдзе звычайная пластыкавая падстаўка для сталовых прыбораў. Пакладзіце яе ў скрыню стала і размяркуеце ў ёй «прылады прыгажосці»: цені, румяны, памады і гэтак далей. А купляючы новую касметыку, выбірайце кампактныя варыянты, каб яна лёгка магла змясціцца ў ваша сховішча і шуфляда добра зачынялася

Правады і нервы не пацерпяць!

Каб падаўжальнік перастаў асацыявацца ў вас з негатыўнымі эмоцыямі — складзіце яго некалькі разоў і ўторкніце ў кардонны валік, які застаўся ад рулона туалетнай паперы. І правады будуць цэлыя, і вашы нервы не пацерпяць!

Выкарыстоўваем сетку ад гародніны для мыцця посуду

Не спяшаецеся выкідваць сетку, якая засталася ад цыбулі, буракоў або бульбы. Зрэжце вузлы і металічныя заціскі, апаласніце вадой. Такая цвёрдая сінтэтычная сетка нашмат лепш справіцца з прыгарэўшымі астаткамі ежы ў каструлі або патэльні, чым мяккая паралонавая губка. Як толькі губка-сетка прыйдзе ў непрыдатнасць — яе не шкада будзе выкінуць.

Прэч пыл з абажура

Ролік з ліпкай стужкай, які выкарыстоўваецца для чысткі мэблі ад поўсці жывёл, выдатна справіцца з пылам на вашым любімым абажуры з тканіны. Правядзіце ролікам уверх-уніз па вонкавым боку абажура некалькі разоў — і ён ізноў стане чыстым. Дарэчы, з той жа задачай справіцца і звычайны шырокі скотч.

Дапаможа маянэз

Налепкі на люстэрку, халадзільніку або буфеце можна выдаліць самым што ні на ёсць экалагічным спосабам. Нашмаруйце налепку маянэзам, пакіньце на некаторы час і затым выдаліце яе з дапамогай пластыкавага нажа, лінейкі, гнуткага шпатэля.

НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ

Соль

Выкарыстоўваецца для паласканняў горла пры ангіне і для ачышчэння носу. Растварыце 1/4 чайнай лыжкі солі ў шклянцы гарачай вады, астудзіце да пакаёвай тэмпературы і палашчыце горла некалькі разоў у дзень. Гэта паменшыць боль і пяршэнне. Можна таксама паласкаць горла растворам харчовай соды. Пры катары палашчыце солевым растворам нос — соль здымае ацёк слізістай.

-2691-

ТАЛІСМАН

Талісман — звычайна невялікая рэч, зробленая з прыродных матэрыялаў (расліны, дрэва, камень, соль, пазней — золата, серабро, медзь, напаўкаштоўныя і каштоўныя камяні), а таксама самі гэтыя матэрыялы, «апрацаваныя» прыродай. Па ўяўленнях старажытнага чалавека, яны прыносяць поспех, засцерагаюць жыццё, спрыяюць сямейнаму дабрабыту і вядзенню адпаведных напрамкаў гаспадарання.

- Найбольш раннімі па часе з'яўлення лічацца талісман прыроднага паходжання, напрыклад, невялікі камень з адтулінай, «перуновы стрэлы» (кавалачкі драўніны, трэскі), якія з'явіліся пасля ўдару маланкі ў якое-небудзь дрэва. З пашырэннем татэмізму ролю талісмана пачалі выконваць зубы, кіпцюры і нават косці жывёл, якіх тое ці іншае племя лічыла сваім першапродкам і ахоўнікам. Відаць, можна не баючыся сказаць, што ўсе жаночыя ўпрыгажэнні адначасова выконвалі ролю абярэга, амулета і талісмана, асабліва тады, калі вопытныя майстры рабілі іх на заказ ад будучага ўладальніка.
- Самым старажытным талісманам і абярэгам славянскіх народаў з'яўляецца «камень Алатыр», шырока прадстаўлены ў замовах. У асяроддзі ўсходніх славян і балтаў ролю Алатыра-каменя выконваў бурштын. Яшчэ да апошняй чвэрці XX ст. беларускія жанчыны насілі бурштынавыя пацеркі, якія не толькі засцерагалі ад уздзеяння ліхога вока, але і прыносілі поспех. У «галубінай кнізе» ён завецца не іначай, як «усім камяням бацька» або «ўсім камяням маці».
- Сярод камянёў ролю талісмана выконваў і «курыны бог» — камень з натуральнай адтулінай. Відаць, на падставе гэтага талісмана ўзнікла павер'е аб тым, што моцным амулетам-абярэгам з'яўляецца манета з прасвідраванай адтулінай, а таксама смаліна, з якой выпаў сук і ўтварылася адтуліна, праз якую прапускаюць ваду для лячэння сурокаў.
- У шэрагу прыродных талісманаў значнае пашырэнне атрымалі спарышы: здвоеныя дубовыя жалуды, арэхі, жытнёвыя каласы, а таксама «жытняя матка» — на адной сцябліне больш за два каласы. Да ліку свяшчэнных талісманаў адносіцца зямля, узятая з магілы сваіх суродзічаў, асабліва ў тым выпадку, калі чалавек ад'язджае з гэтых мясцін надоўга ці назусім. З цягам часу ролю талісмана пачалі выконваць абярэгі, якія былі падрыхтаваныя ў час правядзення каляндарных абрадаў (грамнічная свечка, чацвяровая соль).
- Аналагічную функцыю выконвалі атрыбуты, звязаныя з абрадамі сямейна-родавай накіраванасці: засушаная пупавіна дзіцяці, «сарочка», у якой нарадзілася дзіця, перавяслы рук і ног нябожчыка, засушаны кавалачак вясельнага каравая, заручальныя пярсцёнкі юбіляраў.
- З прыходам хрысціянства кола талісманаў значна пашырылася. Іх ролю сталі выконваць драўляны нацельны крыж, ладанка, просвіра, свечка, медальёны з выявамі святых, у гонар якіх чалавек атрымаў імя, «святыя пісьмы», сшыткі з тэкстамі малітваў і пералікам неспрыяльных дзён, імянныя абразы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4690 Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12